ЦАНА НУМАРУ—5 КАП.

УМОВЫ ПАДПІСКІ
(З дарожным дадаткам „Прафрух")

На 1 мес.		— 90 к.
„ 3 мес.		2 р. 60 к.
„ 6 мес.		5 р. —
„ 12 мес.		9 р. 75 к.

Падпіска і абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газ. „ЗЬВЯЗДА" Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх, тэл. 7-81.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ

За радок нонп. пасьля тэксту—60 к., іншагародніх абвестак—1 р. за радок. Пасярод тэксту—у два разы дарожэй. Пры шматразовым друкаваньні—скідкі. Вышэй тарыфу, згодна пастановы СНК ад 10-IX—24 г. барэшта 10 проц. надатку.

Москва, В-ко РОНК СССР
Зыл. студс. сыск

ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЬ!

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі

ТЭЛЕФОНЫ:

Рэдактар	10-74
Сакратар	6-19
Партсэктар	13-80
Сэктар інфармацыі	13-80
Начны рэдактар	6-42
Галоўная кантора	7-81
Аддзел падпіскі	7-81
„ абвестак	7-81

СУБОТА, 4 кастрычніка 1930 г.
№ 232 (3830)
Год выданьня — XIV.

РЭДАКЦЫЯ І ГАЛОЎНАЯ КАНТОРА
МЕНСК, Савецкая, 63.

Арганізаваць і стаяць на чале новага ўздыму калектывізацыі—важнейшая задача партыйных арганізацый

Масавы прыліў у калгасы адзіноасобных бяднякоў і серадняцкіх гаспадарак — гэтых заўтрашніх калгасьнікаў—у шмат якіх раёнах нашага краю зьяўляецца фактам.

Канчатковая перамога на пляхох сацыяльнай калектывізацыі няўхільна, але не па гэтым прыходзіцца завастрыць увагу сёньня. Посьпехі яшчэ зусім невыстарчальныя. Варта толькі прыгледзецца да таго, як узьнікае новы ўздым калгаснай хвалі, каб убачыць цэлы рад яшчэ нявырашаных задач, цэлы рад абураючых скрыўленьняў лініі партыі ў такой важнейшай справе, якой зьяўляецца арганізацыя новага ўздыму калектывізацыі.

Шматлікія паведамленьні зазначаюць, што новая калгасная хваля ахапіла усюды, дзе яна мае месца, да гэта часу ўзьнімалася **стыхійна.**

Гэта стыхійнасьць паказвае, наколькі яшчэ не пераможаны праваапартуністычная, гнілая тэорыя самацёку і практыка стаўкі на самацёк шырокай масы партыйнаў—калгасных, каапэратыўных і зямельных работнікаў.

Яшчэ і яшчэ раз падкрэсьлім прынцыповы бок справы. Толькі безнадзейныя правы апартуністы, які ня бачыць за тэорыяй і вострасьці клясавага супраціўленьня вёскі, не жадае цьвяроза ацаніць сілу і актыўнасьць яшчэ не разбітага кулацтва,—можа разьлічваць, што шырокія масы селянства, у тым ліку ў калгасы **самацёкам,** бяз сапраўднай шырокай, масавай растлумачальнай і арганізацыйнай работы з боку партыі, савецкай улады і актыву калгасьнікаў.

Толькі шырокая масавая растлумачальная і арганізацыйная работа, толькі рашучая перамога да канца самакрытычных настроеў, толькі далейшае ўзмацненьне наступленьня на кулацтва, побач з рашучым недапушчэньнем рэцыдыву «левых» загібаў можуць забясьпечыць абярненьне новага ўздыму калгаснай хвалі ў сапраўды магутны рух.

Гэтым і заключаецца чарговая задача партыйных арганізацый. Пры гэтым трэба адзначыць, што надзея на лёгкае зьяўленьне толькі агульнай, так можна сказаць, **выходнай** формы праяўленьня апартуністычных тэндэнцый на практыцы. На глебе гэтых «ўзмацненчага» настрою нарадзіць яшчэ больш здавітыя кветкі апартунізму: паслабленьне работы з кулатой, простае прымірэнцтва да кулака, паслабленьне барацьбы з ім («ці не небясьпечны кулак, калі сялянства само «пячэ» ў калгасы»?), проста **тармазьнье** новага прыліву ў калгасы (зараз няма часу гэтым займацца, многа—другіх кампаній, можна часьці на зіму і не ўскладняць...). Гэтыя апартуністычныя тэндэнцыі дзе-нідзе падмацоўваюцца сучаснай хваляй нездаровай тэндэнцыі ацаньня сярод саміх калгасьнікаў, ніякім чынам нельга патураць, бо тэндэнцыя прыватна-ўласьніцкая, і варожая лёзунгу сацыяльнай рэвалюцыі.

Вялікая партыйная арганізацыя павінна памятаць, што рашучая барацьба ўсім гэтымі праяўленьнямі горшага віду правага апартунізму павінна вяцца пастаянна і непаслабна. Для гэтым трэба забясьпечыць бяздакорны аднор усякай справе адрадзіць і ўзмак варожую ленінізму палітыку адміністраваньня і камандаваньня над серадняком.

Трэба арганічна зьвязаць пя толькі асеньнюю сяўбу (там, дзе яна яшчэ ня скончана), але і ўсю работу па **збожжазагатоўках** і па зяблевым узорваньні з задачай арганізацыі новых калгасаў і пашырэньня старых.

Кампанія па **зяблевым узорваньні,** якая паводле пляну павінна захапіць 60 млн. гэкт., да гэтага часу яшчэ не займае адпаведнага месца ў рабоце нашых арганізацый. А між тым гаспадарча-палітычнае значэньне кампаніі **вялізнае.** Зяблевае ўзорваньне кладзе пачатак падрыхтоўцы да веснавой сяўбы 1931 году.

Праводзячы ўзорваньне пад зяб, селянін рыхтуе зямлю для будучае сяўбы. Гэта кампанія можа і павінна быць праведзена пад знакам падрыхтоўкі да веснавой сяўбы ў **калектыўных формах.**

Практыка высунула цэлы рад форм масавай работы па новым росьце калектывізацыі—справаздачы калгасаў перад адзіноасобнікамі, вярбовачныя камісіі з калгаснага і сельскага актыву, ініцыятыўныя групы па стварэньні новых калгасаў і г. д. Усе гэтыя формы работы, а таксама і другія, якія выпрацоўваюцца масовай практыкай, павінны быць прыстасаваны.

Калі ў асноўных збожжавых раёнах галоўным стрыжнем работы па далейшым росьце калектывізацыі, акрамя зяблевага ўзорваньня, зьяўляюцца **збожжазагатоўкі,** дык для раёнаў тэхнічных культур такую-жа ролю павінна адыграць правільная пастаноўка **ўборкі і загатоўкі** бавоўны, ільну, буракоў, тытуню, новых тэхнічных культур.

Калі ў раёнах суцэльнай калектывізацыі мы праводзім лёзунг ліквідацыі кулацтва, як класы, дык у раёнах, дзе калектывізацыя разьвіта слабей, трэба ўзмацніць выцясьненьне і абмежаваньне кулацтва, падрыхтоўваючы яго ліквідацыю. У гэтай форме павінна ажыцьцяўляцца тут наступленьне сацыялізму па ўсім фронце.

Асноўнай формай калектыўнае гаспадаркі для данага перыяду зьяўляецца с.-г. **арцель.** Абагульваючы **раўнаючую масу асноўных сродкаў вытворчасьці** і ўсе галоўнейшыя тавары шляхам гаспадаркі, арцель стварае моцную базу для далейшага ацаньня данага «воспроизводства» гаспадаркі на сацыялістычным шляху.

Сваясаблівай формай правага апартунізму, якая адлюстроўвае напіск кулацтва, зьяўляюцца спробы **падмяніць** арцель, як асноўную форму калгасу, прасьцейшымі таварыствамі. Гэтым спробам павінен быць даны рашучы адпор. У збожжавых раёнах уся работа па арганізацыі новага прыліву павінна быць накіравана да стварэньня новых арцеляў і ўмацаваньня і пашырэньня існуючых. У тых раёнах, дзе прасьцейшыя таварыствы зьяўляюцца карыснай пераходнай формай, гэта форма павінна быць усямерна скарыстана, аднак, нельга забываць, што і тут асноўнай формай калгаснага руху зьяўляецца **арцель.**

Партыйныя арганізацыі зпойдуць у сябе сілы перамагчы апартуністычныя тэндэнцыі правага і «левага» толку, па-бальшавіцку арганізаваць і стаць на чале новага ўздыму калектывізацыі і ператварыць яго ў магутны масавы рух. («Правда»).

Наступленьне Чырвонай арміі Кітаю на Канчаў

Друк імпэрыялістых зноў б'е трывогу

КАНЧАН ПАД ПАГРОЗАЙ

ШАНХАЙ, 2. Кітайскі друк паведамляе, што кітайскія чырвоныя войскі пад кам. Пэн Дэ-хуэя і Чжу-Дэ пачалі наступленьне на сталіцу правінцыі Цзяксі—Канчан. Друк лічыць становішча горадам.

ЧАНАЯ ВЕСКА Ў РУКАХ КАМУНІСТЫХ»

ШАНХАЙ, 2. Друк імпэрыялістых у зноў б'е трывогу, паведамляючы становішча на раёне Янцзы «робіцца ...ьш напружаным».

«Кожным днём пішуць газэты, чырвоны лаг у Кітаі становіцца ўсё больш ...ы прыкметным. На поўдзень ад ...(ксрт на раёз Янцзы ў правінцыі ...бей) кожная вёска знаходзіцца ў ...камуністых. Ва многіх мясцох прыкметны вялікія групы ўзброеных чырвонаармейцаў, якія рухаюцца ўверх па Янцзы. Чырвоныя становяцца ўсё больш адважнымі.

Друк паведамляе, што актыўнасьць камуністых у раёне Ханькоў (правінцыя Хубей) усё больш узмацняецца. У вархоўях ракі Ц цы чырвоныя занялі Цзянлі. На поўні правінцыі Хэнань чырвоныя войскі захапілі горад Люлін, разбурыўшы чыгуначнае палатно і 7 мастоў на чыгунцы. Зносіны прыпынены.

Паводле вестак газэт, амэрыканцы і ангельцы, якія пражываюць у Чанша (галоўны горад правінцыі Хэнань), пераплылі на зіму выехаць з гораду з прычыны **пагрозы захопу Чанша чырвонымі войскамі** і немагчымасьці паслаць замежныя ваенныя суды па раёе да Чанша з-за спаду вады.

НАШ ГАНДАЛЬ З АМЭРЫКАЙ

Вынікі супроць савецкай кампаніі

НЬЮ-ЁРК, 1. Аморг (гандлёвая арганізацыя СССР у ПАЗША) апублікаваў ...ньне аб зваротах савецка-амэрыканскага гандлю за мінулы гаспадарчы год. Агульная сума зваротаў складае 28 проц. больш, чым у папярэднім годзе. Агульны кошт савецкіх ...ваў дасягае **145 млн. даляраў** — ...проц. больш, чым у мінулым годзе. ...ніе савецкіх тавараў, праданых ...ым Штатам, складае **32 млн. даляраў** — **на 3½ проц. больш,** чым у ...ным годзе.

...ыня Амторгу тав. **Багданаў,** у ...м з прадстаўнікамі друку заявіў, ...ю першых 6 месяцаў мінулага году, савецка-амэрыканскі гандаль хутка рос. Аднак, пачаў скарачацца ў красавіку. Ён пачаў скарачацца, якія выкліканы гэта скарачэньні. **Папершае,** ...ныя ўмовы, ...ы амэрыканскія фірмы аказваюць ...ца кредытаваць гандаль у СССР. **Падругое,** ...ная жорсткая супроцьсавецкая кампанія ў Злучаных Штатах і асабліва кампанія, накіраваная супроць увозу савецкіх тавараў.

Тав. Багданаў напамінае, што свае закупкі ў Злучаных Штатах Савецкі Саюз можа аплачваць толькі за кошт продажу сваіх тавараў заграніцу. Таму **кампанія, накіраваная супроць савецкага вывазу, у канчатковым рахунку б'е і па вывазе капіталістычных краёў у СССР.** Тав. Багданаў указвае, што за мінулы гаспадарчы год Савецкі Саюз закупіў у Злучаных Штатах на 121 млн. даляраў машын.

— Аднак, — заявіў тав. Багданаў, — пашырэньне амэрыканскага вывазу будзе магчымым толькі ў тым выпадку, калі амэрыканскія прамыслоўцы пойдуць насустрач патрэбам савецкага гандлю (кредыты і сыненьне кампаніі супроць савецкіх тавараў).

ПА САВЕЦКІМ САЮЗЕ

Новыя назначэньні

Тав. Хінчук—паўпрэд СССР у Нямеччыне

МАСКВА. Прэзыдыум ЦВК СССР аслабаніў т. КРЭСЬЦІНСКАГА Мікалая Мікалаевіча ад абавязкаў паўнамоцнага прадстаўніка СССР у Нямеччыне.

МАСКВА. Прэзыдыум ЦВК СССР назначыў т. Хінчука, Льва Міхайлавіча паўнамоцным прадстаўніком Саюзу ССР у Нямеччыне, аслабаніўшы яго ад абавязкаў намесьніка народнага камісара зьнешняга і ўнутранага гандлю СССР.

* * *

Хінчук Л. М. нарадзіўся ў 1868 годзе. Да рэвалюцыйнага руху далучыўся са школьнай лаўкі. Скончыў экстэрнам гімназію, а потым вучыўся далей на філёсофскім факультэце ў Бэрне (Швэйцарыя), дзе далучыўся да сацыял-дэмакратыі, насьля авароту ў Расію працаваў у розных гарадох, як прафесыянал-рэвалюцыянэр. На раз арыштоўваўся, прасядзеў некалькі год у турме і 6 год правёў у ссылцы ў Якуцкай вобласьці.

У час рэвалюцыі з 1905 г. т. Хінчук быў выбраны ў выканаўчы камітэт Пецярбурскага савету рабочых дэпутатаў. Пасьля разгрому рэвалюцыі 1905 году зноў быў некалькі раз арыштаваны. У пэрыяд імпэрыялістычнай вайны быў у групе меншавікоў, якія выказаліся за актыўную агітацыю супроць вайны.

Пасьля лютаўскай рэвалюцыі быў выбраны старшынёй Маскоўскага савету рабочых дэпутатаў. Быў членам ЦК партыі меншавікоў, з якой выйшаў у канцы 1919 году і ўступіў у кампартыю. У 1920 годзе т. Хінчук быў назначаны членам калегіі Наркампроду, а ў наступным годзе — выбраны старшынёй Цэнтрасаюзу, дзе прапрацаваў на працягу некалькіх год. У 1926 г. быў выбраны старшынёй савету Цэнтрасаюзу, старшынёй Усерасійскага Цэнтральнага каапэратыўнага савету. Адначасова быў выбраны ў прэзыдыум ЦВК СССР. У лістападзе 1926 году быў назначаны гандлёвым прадстаўніком СССР у Злікабрытаніі. У маі 1927 году прымаў удзел у складзе делегацыі СССР на міжнародным эканамічнай канфэрэнцыі. У лістападзе 1927 г. т. Хінчук быў назначаны намесьніком народнага камісара па замежным і ўнутраным гандлі СССР і прапрацаваў на гэтым посту да свайго новага назначэньня.

Гадрыхтоўка раёнаў да веснавой сяўбы

Пасеўныя заданьні раёнам павінны быць даны не пазьней 1 лістапада

МАСКВА 3. Калегія НКЗ СССР абавязала НКЗ Саюзных рэспублік і краёвых зямельных кіраўніцтваў даць усім адміністрацыйным раёнам пасеўныя заданьні да вясны 1931 г. па культурах і сэктарах не пазьней 1 лістапада.

Да сельсавету заданьне павінна быць даведзена не пазьней 15 лістапада. Паміж 15 лістапада і 1-м студзеня пасеўныя пляны распрацоўваюцца сельсаветамі. Не пазьней 1 студзеня 1931 г. пляны павінны быць даведзены да калгасу і пасобнага двара.

Да гэтага-ж тэрміну сельсаветы даюць цьвёрдыя заданьні кулацкім гаспадаркам.

Насеньныя і страхавыя фонды стварэюцца ў калгасах Уралу, Сібіры і Казахстану не пазьней 15 лістапада, а ў астатніх раёнах—да 1 лістапада. Страхавыя фонды стварэюцца ў калгасах на Урале і інш. раёнах да 1 лістапада. Страхавыя фонды ў адзіноасобных гаспадарках (у разьмеры 20 проц. запатрабаваньняў усёй пасеўнай плошчы) павінны быць створаны да 1 студзеня 31 г. Абмен гатунковага насеньня на радавое трэба закончыць да 1 студзеня 1931 г., а насеньняачыстку да 1 лютага таго-ж году.

ПРАЕКТ АДЗІНАЙ НАБОРНАЙ КНІЖКІ

МАСКВА, 3. Сэктар рацыяналізацыі Цэнтрасаюзу закончыў распрацоўку праекту новага наборнага дакумэнту, які дае магчымасьць больш шырока і плянава праводзіць разьмеркаваньне тавараў і іх улік. Гадавы камплект новай наборнай кніжкі будзе складацца з вокладкі, чатырох квартальных лісткоў на прамтавары і 12 месячных лісткоў на прадукты.

Для найшчыкаў выпускаюцца спэцыяльныя гадавыя талёны, якія на ліцавой старане маюць таблічку для кантраляваньня пагашэньня іх.

Пры пераездках на другое месца вокладка наборнай кніжкі не абмяняецца і мае моц на ўсёй тэрыторыі СССР. Выдача наборных дакумэнтаў пачнецца ад студзеня 1931 году і у асноўным будзе рабіцца праз домакіраўніцтва.

Праект новай наборнай кніжкі заацьверджаны на апошнім пасяджэньні прэзыдыума Цэнтрасаюзу СССР і перанесены на разгляд Наркамгандлю Саюзу.

ПАДРЫХТОЎКА ГРАНДЫЁЗНАГА АРКТЫЧНАГА ПЕРАЛЁТУ

ЛЕНІНГРАД, 2. У Ленінград прыехаў старшыня авіяцыйнай сэкцыі Цэнтральнага Савету Ассавіяхіму інжынэр Варабёў. У гутарцы з супрацоўнікам Роста, ён паведаміў, што у наступным 1931 годзе адбудзецца грандыёзны арктычны пералёт дырыжабля «Граф Цэпэлін», які арганізуецца аэраарктычнай. Маршрут палёту наступны: Вардзе (Нарвэгія) уздоўж узьбярэжжа Грэнляндыі, праз зямлю Францыі Іосіфа на Аляску. У сучасны момант у горадзе Фэрэнкс закончана абсьлядаваньне спэцыяльнай прычальнай мачты для дырыжабля. З Аляскі дырыжабль пройдзе над сібірскімі берагамі на зямлю Урангеля і зямлю Францыі Іосіфа, адкуль вернецца ў Вардзе. Гэты грандыёзны арктычны рэйс будзе мець вялізнае навуковае значэньне. На борту дырыжабля будуць знаходзіцца савецкія вучоныя.

Новая інструкцыя аб выборах у саветы

МАСКВА, 3. Прэзыдыум ЦВК СССР зацьверджаў інструкцыю аб выбарах у саветы. У асноўным яна зьяўляецца «воспроизводством» інструкцыі 1926 г. Уносіцца толькі рад дадаткаў і растлумачэньняў у адносінах пазбаўленьня выбарчых праў, уключэньня рабочай сілы і інш. Разьдзел аб лішэнцах удакладнен. Больш падрабязна пералічваюцца выпадкі як пазбаўленьня выбарчых праў, так і парадку аднаўленьня. Падрабязна распрацаваны тэрміны складаньня сьпісу выбаршчыкаў і скаргаў. У адзнаку ад папярэдніх у гэтай інструкцыі больш дакладна і прыстасоўна да ліквідацыі акруг пералічаны склад выбарчых камісій. Інструкцыя больш дакладна пералічвае правы саветаў. Паводле гэтай інструкцыі сельскія саветы толькі складаюць сьпісы пазбаўленых праў, а канчатова зацьверджаюць іх раённыя выканаўчыя камітэты.

УСТАНОЎКА МАГУТНАЙ КАРОТКАХВАЛЯВАЙ РАДЫЁСТАНЦЫІ Ў ЛЕНІНГРАДЗЕ

ЛЕНІНГРАД, 2. Таварыства «Прыхільнікаў радыё» пабудавала ў Ленінградзе магутную кароткахвалявую радыёстанцыю. На гэту станцыю ўскладаецца задача абслугоўваць усе экспэдыцыі і кароткахвалявыя радыёпункты на поўначы. Нядаўна ўстаноўлена пастаянная радыёсувязь з зямлёю Францыі Іосіфа.

АДКРЫЦЬЦЁ НОВЫХ ПАВЕТРАНЫХ ЛІНІЙ

МАСКВА, 2. Вышкі індустрыялізацыі Савецкага Саюзу ўжо даюць сябе адчуваць на яго грамадзянскім паветраным флёце. У трэцім годзе пяцігодкі агульная даўжыня паветраных ліній СССР дасягне 26.000 клм., г. зн. амаль дасягне даўжыні паветраных ліній Нямеччыны, альбо Францыі. Значна павялічваецца самалётны і маторны парк савецкіх ліній, у прыватнасьці, у масавую эксплёатацыю ўводзіцца вялікія трохматорныя самалёты тыпу «Крыльлі Саветаў». Адкрываецца рад новых ліній, на якіх такая ліня, як **Масква—Узпен, зьявіцца самай доўгай паветранай лініяй на зямной кулі.** Пачынаючы з гэтае зімы гэтыя лініі таксама, як і старыя лініі будуць працаваць на працягу ўсяго году.

ПАБУДОВА ПЕРШАЙ У СССР СОНЕЧНАЙ СТАНЦЫІ

САМАРКАНД, 1. У Самаркандзе канчаецца пабудова першай у СССР станцыі па выкарыстаньні сонечнай энэргіі. Праведзеныя станцыяй досьледы паказваюць сонечнай энэргіі далі дасканалыя результаты.

БУЙНАЕ МЕСЦАНАРАДЖЭНЬНЕ ОЛАВА

ВЕРХНЯ-ВУДЗІНСК, 2. У Агінскім каймену знойдзена буйнае месцанараджэньне олава. **Распрацоўка яго будзе мець саюзнае прамысловае значэньне.**

КЛЯСАВАЯ БАРАЦЬБА ЗА МЯЖОЮ

ПАХОД ПРАМЫСЛОЎЦАЎ НА ГАЛОДНУЮ ЗАРПЛАТУ РАБОЧЫХ У НЯМЕЧЧЫНЕ

БЭРЛІН, 29. Паводле вестак, бэрлінскія металяпрамыслоўцы дабіваюцца 15 проц. скарачэньня заработнай платы рабочым. Справа не абмяжоўваецца толькі Бэрлінам. У **Саксоніі, Вэстфаліі, Брандэнбургу, Памаравіі і ў іншых мясцох** прадпрыемцы таксама патрабуюць скарачэньня заработнай платы металістам на 15-20 проц. Тыднёвая заработная плата нямецкіх металістых у даны момант складае для кваліфікаваных рабочых 58 марак, для некваліфікаваных—49 марак, для работніц — 29 марак. Аднак, рэальны заработок бэрлінскіх металістых фактычна значна меншы у выніку адлікаў на падатках і ўзносах на сацыяльным страхаваньні. У агульнай складанасьці рэальная заработная плата ва ўмовах пенарыўнага росту дарагоўлі складае толькі **68 проц. даваеннай зарплаты кваліфікаваных рабочых, 66 проц. для некваліфікаваных і 74 проц. для жанчын.** Урэзка зарплаты металістых на 15 проц. зьвяжэ яе **да паловы даваеннага заработку.**

У той-жа час растуць прыбыткі металяпрамыслоўцаў. У выніку 15 проц. скарачэньня галоднай зарплаты рабочых і без таго вялізарныя прыбыткі павялічацца яшчэ на 47 млн. марак у год. Нават буржуазны эканамісты Кучынскі вымушаны быў канстатаваць днямі, што калі-б заработная плата рабочым пе скарацілася, а павялічылася на 20 проц., яна-б усёроўна не магла дагнаць рост дарагоўлі. (ТАСС).

ПРАЦЭС 15 КАМСАМОЛЬЦАЎ У ЛЕЙПЦЫГУ

БЭРЛІН, 1. У Лейпцыгу пачаўся працэс 15 камсамольцаў, арыштаваных у зьвязку з крывавымі падзеямі ў часе пятага ўсянямецкага зьлёту рабочай моладзі ў красавіку 1930 г. у Лейпцыгу, у якім прымала ўдзел звыш 100 тысяч чалавек. У часе зьлёту паліцэйскія адкрылі агонь на калёне дэманстрантаў, адзін малады рабочы быў забіты. Абураныя рабочыя, абараняючыся, забілі 2-х паліцэйскіх афіцэраў і прымусілі паліцыю адступіць.

Гандаль рабочымі

ВЕНА, 2. Як паведамляюць з Будапэшта, венгерскі ўрад, жадаючы паслабіць рост рэвалюцыйных настроеў сярод беспрацоўных, абмяркоўвае планы перасяленьня беспрацоўных у іншыя краіны. Адпаведныя перагаворы з Бразыліяй і Аргентынай скончыліся паўдачай. Учора міністар унутраных спраў Спытоўскі заявіў, што паміж венгерскім і францускім урадам адбываюцца перагаворы аб **перасяленьні венгерскіх рабочых у Францыю.** У Будапэшце будзе адкрыта спэцыяльнае бюро, якое займецца вэрбоўкай рабочых для перасяленьня ў Францыю. **Зусім ясна, што засербаваныя рабочыя будуць адпраўлены ў ...ускія капёніі і адчуюць на сабе пануючую там жудасную эксплёатацыю.**

Незадаваленьне с.-дэмакратычных рабочых «правадырамі» расьце

БЭРЛІН, 1. Незадаваленьне сярод нямецкіх рабочых, якія знаходзяцца ў радах с.-д. партыі, усё больш ўзмацняецца. Усё гучней і гучней раздаюцца галасы незадаволеных. Бурныя сходы с.-д. адбыліся ў **Хэмніцы, Гамбургу** і інш. гарадох. На сходзе с.-д. арганізацыі ўсходняга раёну ў Хэмніцы рабочыя патрабавалі **звальненьня з кіруючых пасад усіх элемэнтаў, якія разпажыліся, барацьбы супроць парткіраўніцтва і карэннага перагляду праграмы с.-д. партыі.** Прамоўцы зазначалі, што сумленныя элемэнты нямецкае рабочае клясы групуюцца вакол нямецкай кампартыі. Далей прамоўцы дамагаліся правядзеньня чысткі і выдаленьня з партыі Вэльса (старшыня партыі), Гіфэрдзінга і інш. правадыроў. (ТАСС).

Расьце ўплыў і папулярнасьць ангельскай кампартыі сярод рабочых

ЛЕНДАН, 1. Кампанія руху меншасьці, пачатая з мэтай аб'яднаць рабочых вакол «рабочай» хартыі (праграма рэвалюцыйных патрабаваньняў ангельскіх рабочых), праходзіць з вялікім посьпехам. Унутраная барацьба ў кампартыі спынена. Пасьпяшаньць, якая наглядалася ў мінулым годзе, ліквідавана. Пад лёзунгам «у масы» партыя вядзе актыўную прапаганду, у якой прымае дзейны ўдзел орган партыі «Дэйлі Уоркер». Узросшая актыўнасьць кампартыі знайшла бесадкладнае сваё адлюстраваньне ў росьце **не папулярнасьці і ўплыву.** Мітынгі, якія склікаюцца кампартыяй, масава наведваюцца рабочымі. Спэцыяльная брашура **Гары Паліта,** выпушчаная па пытаньні становішча рабочае клясы ў Англіі, распаўсюджана на працягу некалькіх тыдняў у колькасьці 50 тыс. экзэмпляраў. Рабочыя не абмяжоўваюцца купляю аднаго экзэмпляру, а набываюць па 10-20 для распаўсюджаньня брашуры сярод сваіх прыяцеляў.

КАПІТАЛІСТЫЧНАЯ АХОВА ПРАЦЫ

ЛЕНДАН, 2. Ва Ўальсале (каля Бірмінгама) на каменна-вугальнай руднікі Грове абвалуся выбух, у час якога загінула 14 вугляко́паў. Выбух, відавочна, адбыўся з-за скапленьня газаў у капальнях. Гэта трэці вялікі нящчасны выпадак за апошнія чатыры тыдні ў ангельскай вугальнай прамысловасьці. (ТАСС).

МАСАВЫЯ АРЫШТЫ У БЭСАРАБІІ

ВЕНА, 2. Як падаюць з Бухарэста ў Кішынёве і інш. гарадох Бэсарабіі охранка арыштавала 300 чалавек з тае прычыны, што камуністычная партыя актыўна рыхтуе баявыя дэманстрацыі па ўсёй Бэсарабіі да 13-цігодзьдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі. (ТАСС).

ТОК АСІНБУДУ

САЎГАСАМ І КАЛГАСАМ

Саўгас Высокае і калгас «Чырвоны прамень» атрымалі ток ад Асінбуду. НА ЗДЫМКУ: праводка і электрычная вячыстка насеньня

Выканаць дырэктывы партыі

Пастанова сакратарыяту ЦК КП(б)Б аб справаздачна-перавыбарчай кампаніі дэлегацкіх сходаў ад 1-X-30 г.

ЦК адзначае, што справаздачна-перавыбарчая кампанія дэлегацкіх сходаў па большасьці прадпрыемстваў пачалася са значным спазьненьнем і да гэтага часу не разгорнута, як масава-палітычная кампанія, а пасобныя арганізацыі (Гомель) яшчэ зусім не прыступілі да падрыхтоўкі гэтай кампаніі.

ЦК КП(б)Б асабліва адзначае адсутнасьць удзелу ў перавыбарах дэлегацкіх сходаў прафсаюзаў і друку.

Партарганізацыі не ўвялі перавыбараў дэлегацкіх сходаў з кампаніяй па прапрацоўцы адозвы ЦК УсеКП(б) і не выкарыстоўваюць перавыбары для мабілізацыі новых пластоў работніц на пасьпяховае выкананьне чарговых палітычных задач, пастаўленых адозвай.

Такія адносіны да справаздачна-перавыбарчай кампаніі дэлегацкіх сходаў ЦК КП(б)Б разглядае, як недаацэнку важнасьці работы сярод работніц, зыходзячы з гэтага ЦК пастанаўляе:

1. Працягнуць тэрмін справаздачна-перавыбарчай кампаніі дэлегацкіх сходаў да 15-X—30 г. і прапанаваць Гаркомам, Райкомам і парткалектывам неадкладна прыняць усе захады да забясьпечэньня шырокага разгортваньня справаздачна-перавыбарчай кампаніі дэлегацкіх сходаў, дабіўшыся поўнага і ніўхільнага выкананьня дырэктыў ЦК па гэтым пытаньні.

2. Газэтам, асабліва «Зьвязда», «Рабочай», «Сав. Беларусь», «Беларуская Вёска», неадкладна прыступіць да правядзеньня ў жыцьцё дырэктыў ЦК, вызначаных у пастанове аб справаздачна-перавыбарчай кампаніі дэлегацкіх сходаў.

Абавязаць друк вынурваць і бязьліцасна біць па нядбайных і правапартуністычных адносінах да выкананьня партыйных дырэктыў у галіне работы сярод працоўных жанчын гораду і вёскі.

3. Фракцыі ЦСПСБ праверыць як прафарганізацыі ўключыліся ў правядзеньне перавыбараў дэлегацкіх сходаў.

4. На наступным пасяджэньні Сакратарыяту заслухаць інфармацыю Кастрычніцкага, Барысаўскага РК і парткалектыву фабрыкі «Дзьвіна» аб ходзе справаздачна-перавыбарчай кампаніі.

5. Для правядзеньня справаздачна-перавыбарчай кампаніі дэлегацкіх сходаў на вёсцы мабілізаваць 30 адказных работнікаў тэрмінам на 15 дзён.

1. Маслова—Саюз Сельгаслесрабочых.
2. Ратнэр — ЦСПСБ.
3. Чарнабродава — ЦСПСБ.
4. Юшкевіч — Быткамісія ЦВК
5. Адамчук — Белкаапсаюз.
6. Юткес — Саюз «Рабіс».
7. Кірнас — Калгасцэнтр.
8. Шустэр — Наркамправы.
9. Вішнеўская — ВСНГ.
10. Камянецкая—Гарадзкі дашкольны інспэктар.
11. Лебедзева — Наркамасьветы.
12. Гольдвасэр — Белжылсаюз.
13. Гурэвіч—Нарком Аховы Здароўя.
14. Тэтэвіч — Ахова Матэрынства і Маладзенства.
15. Пятроўская — Наркамгандаль.
16. Варабёва — АСО-Авіяхім.
17. Сташэўская — ЦК МОПР'у.
18. Эфраімская — Белтаапсаюз.
19. Левіна — Дом Камасьвяты.
20. Калабаева — Наркамсувязь.

Даручыць Гомельскаму і Віцебскаму Гаркомам выдзеліць на 5 адказных работнікаў для пасылкі на перавыбарчую кампанію дэл. сходаў на паказальных Агітмасавага Аддзелу ЦК.

У ФАШЫСЦКАЙ ПОЛЬШЧЫ

Фашысцкі ўрад—за далейшыя расстрэлы украінскіх сялян

ВАРШАВА, 2. У сувязі з падзеямі на Заходняй Украіне, у Варшаву прыбыў украінскі мітрапаліт Шэптыцкі і быў прыняты міністрам унутраных спраў Складкоўскім. Складкоўскі заявіў, што **урад стаў на шлях зьнішчэньня элемэнтаў, якія стараюцца сеяць анархію, з гэтага шляху ўрад ня зыйдзе.** Адначасова Складкоўскі прапанаваў Шэптыцкаму, што калі украінскае духавенства ня будзе ўплываць на насельніцтва адпаведна патрабаваньням уладу, дык урад зробіць з гэтага адпаведныя высновы. Пасьлядняя місія мітрапаліта Шэптыцкага закончылася тэкім чынам поўнай плудачай. (ТАСС).

Далейшыя арышты б. дэпутатаў

ВАРШАВА, 2. Учора ў Варшаве арыштаваны былы дэпутат «Вызваленьня» **Смола,** у Чэнстахове арыштаваны член сялянскай партыі Сольчык, у якога пры вобыску адбралі 4 тыс. адозваў цэнтралевага блёку. У Тарнопалі арыштаваны былы дэпутат Ундо, адзін з блізкіх мітрапаліта Шэптыцкага, поп Куніцкі, а таксама член украінскай радыкальнай партыі Ладыко. (ТАСС).

Катаржны прысуд над рэвалюцыйнымі рабочымі

ВАРШАВА, 2. У Беластоку закончыўся працэс 7-мі чалавек, абвінавачаных нібы ў прыналежнасьці да кампартыі Заходняй Беларусі. Абвін. зачаны гаворны да катаржнай турмы ад 6-ці да 8-мі год. (ТАСС).

Від на будаўніцтва новага корпусу ф-кі «Кастрычнік» у г. Менску

ХОД ВЫБАРАЎ У ФІНЛЯНДЫІ

Выборчыя вучасткі ў рабочых раёнах пустуюць

ГЭЛЬСІНГФОРС, 2. Паводле вестак газэт, першы дзень выбараў у сойм прайшоў усюды пры больш актыўным удзеле выбаршчыкаў, чым гэта мела месца на мінулых выбарах. Па словах «Гельсінгін Саномат» у Гэльсінгфорсе паводле папярэдніх падлікаў у 51 выбарчым вучастку (усяго вучасткаў 52) у першы дзень галасавала 52.986 чалавек з агульнай колькасьці выбаршчыкаў у 127.558, што складае 41,5 проц. На мінулых выбарах у Гэльсінгфорсе ў першы дзень галасавала 26 проц. На выбарах у 1927 годзе галасавала 30 проц. Па вестках тэй-жа газэты у радзе месц удзел выбаршчыкаў у першы дзень перавышае 50 проц. Найбольш слабая актыўнасьць выбаршчыкаў адзначана ў Кексгольме (31 проц.).

Другі дзень выбараў прайшоў у Гэльсінгфорсе вельмі вяла. Вуліцы маюць звычайны выгляд. У цэнтры гораду ў выбарчых вучастках пераважнаму дзяжурацъ на аўтамабілях пікеты фашысцкіх студэнтаў. У рабочых раёнах фашысцкія пікетчыкі, аднак, не пасьмелі накіравацца. Выбарчыя вучасткі ў цэнтры, а таксама ў рабочых раёнах, амаль пустуюць. (ТАСС).

У АПОШНЮЮ ХВІЛІНУ

13 кастрычніка—адкрыцьцё нямецкага рэйхстагу

БЭРЛІН, 3. Прэзыдэнт рэйхстагу Лёбэ абвясьціў, што адкрыцьцё рэйхстагу адбудзецца 13 кастрычніка.

КІТАЙСКАЯ ПАЛІЦЫЯ Ў ЯРАСЬЦІ

ШАНХАЙ, 2. Друк паведамляе, што нядаўна гамінданаўскай паліцыі ўдалося выкрыць друкарню падпольнай камуністычнай газэты «Хунці-бао», арыштаваць рэдактара, 16 наборшчыкаў, захапіць шрыфт, паперу і г. д. Ня гледзячы на разгром друкарні і арышт работнікаў, газэта «Хунці-бао» праз некалькі дзён зноў выйшла, хаця і ў некалькі паменшаным фармаце. Рэдакцыя газ

ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА

КАЛГАСНАЯ ЯЧЭЙКА--БАЯВЫ ШТАБ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ

Расчысьціць шлях ад правых апартуністых для новага калгаснага прыліву

Кожны камуністы павінен ведаць „палажэньне аб ячэйцы УсеКП(б) у калгасе"

У «Праўдзе» ад 7 верасьня апублікавана прынятае у аснову Цэнтральным Камітэтам УсеКП(б) «палажэньне аб ячэйцы УсеКП(б) у калгасах». Апублікоўваючы гэта «палажэньне», ЦК УсеКП(б) палічыў неабходным шырока абмеркаваць яго сярод партыйцаў, якія працуюць на вёсцы і тым, каб мабілізаваць іх увагу на ўмацаваньне работы партыйных арганізацый вёскі.

Апублікаваньне «палажэньня» выразна акрэсьлівае задачы парт'ячэек у калгасах. Яны (гэтыя задачы) вынікаюць з пастаноў XVI партыйнага зьезду па сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

Наколькі зьявілася своячасовым і неабходным такое, адпавядаючае сучасным задачам партыі на вёсцы «палажэньне», гаворыць ред фактаў, якія мы маем і па нашай КП(б)Б у рабоце калгасных ячэек. З апублікаваных ніжэй допісаў відаць, што рад калгасных парт'ячэек ня узяўся за выразьненьне тых вузлавых задач, якія пастаўлены перад імі партыяй, ня сталі сапраўднымі рухавікамі замацаваньня і далейшага разгортваньня калектывізацыі. Некаторыя з калгасных ячэек ня маюць цьвёрдага разуменьня, не ўплываюць сабе выразна тэй сумы задач, якія пастаўлены перад імі генэральнай лініяй партыі.

— «Палажэньне аб ячэйцы УсеКП(б) у калгасе» зусім выразна гаворыць, што «усямернае ўмацаваньне і далейшае разьвіцьцё калгасаў шляхам лепшай арганізацыі вытворчасьці, ўжываньня больш удасконаленай сельгаспадарчай тэхнікі, правільнай арганізацыі працы і ўкараненьня агрыкультурных мерапрыемстваў; арганізацыя правільнага разьмеркаваньня прыбыткаў у калгасе на аснове стымулаваньня высокай прадукцыйнасьці працы, павялічэньне абагуленых фондаў і павышэньне матар'яльнага і культурна-бытавога ўзроўню калгасьнікаў»... і г. д.—зьяўляецца асноўнай задачай калгаснай ячэйкі.

Даючы ўстаноўку ў пытаньні СТРУКТУРЫ КАЛГАСНАЯ ЯЧЭЙКІ, ПАЛАЖЭНЬНЕ ВЫРАЗНА ВЫЗНАЧАЕ РОЛЮ, ЗАДАЧЫ І ЎДЗЕЛ ЯЧЭЙКІ Ў ГАС ПАДАРЧЫМ ЖЫЦЬЦІ КАЛГАСУ, ПА МАСАВАЙ РАБОЦЕ, ПА ЎНУТРЫПАРТЫЙНАЙ РАБОЦЕ, КІРАЎНІЦТВЕ РАБОТАЙ НЕПАРТЫЙНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ І Г. Д.

Перад райкомамі, бюро партыйных ячэек паўстае задача забясьпечыць абгаварэньне апублікаванага «палажэньня», сабраць і падагуліць той вопыт, які ўжо набыты ў рабоце калгаснай ячэйкі. Адначасова з гэтым кіруючыя і радавыя работнікі калгасных ячэек павінны праз партыйны друк шырока абмеркаваць «палажэньне», унесьці свае прапановы як адносна арганізацыйнай структуры калгаснай ячэйкі, так і ў пытаньнях у тэй ці іншай галіне работы.

Да пытаньня аб калгаснай ячэйцы

(У парадку абгаварэньня)

У адпаведнасьці з задачамі сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі павінны быць перабудаваны вясковыя партарганізацыі. Усе вясковыя ячэйкі трэба рэарганізаваць у ячэйкі калгасаў і саўгасаў. Гэта рэарганізацыя не павінна паслабіць кіраўніцтва з боку ячэек работай сельсаветаў, арганаў кааперацыі і іншых грамадзкіх арганізацый вёскі. Наадварот зараз неабходна значэньне увагу ўсіх вясковых партарганізацый на пастаноўку ўнутрыпартыйнай работы, паляпшэньне якасьці партыйнага кіраўніцтва, забясьпячэньне правільнага росту партыі, лепшую пастаноўку партвучобы, падрыхтоўку і падбор кадраў і інш.

Трэба адзначыць, што ў радзе раённых партарганізацый мае месца недаацэнка задачы паляпшэньня ўнутрыпартыйнай работы і яе перабудовы. Возьмем для прыкладу **Касьцюковіцкую раённую партарганізацыю.** Райком і яўлі праводзяць работу на калектывізацыі сельскай гаспадаркі і выкананьні бліцуных—гаспадарча-палітычных задач, а ўсю ўнутрыпартыйную работу [illegible] Апарат райкому не рэарганізаваны. Структура ячэек у большасьці [illegible] не прыстасавана да задач павароту «тварам да вытворчасьці». Нарыклад члены ячэйкі—усе калгасьнікі, а ячэйка лічыцца пры сельсавеце.

Само жыцьцё высоўвае задачу рэарганізацыі вясковай парт'ячэйкі—пераход яе ад тэрытарыяльнага да вытворчага прынципу арганізацыі. У аснове гэтага прынципу ляжыць стварэньне сеткі вясковай партарганізацыі адпаведна сетцы разьвіцьця калгасаў і саўгасаў.

У кожным калгасе і саўгасе, дзе ёсьць належная колькасьць партыйцаў (ня менш 3-х членаў [illegible]), трэба арганізаваць ячэйкі там, дзе няма гэтай колькасьці членаў партыі—трэба арганізаваць партгрупы ці вылучыць партарганізатараў. У брыгадах, павінны таксама вылучацца партарганізатары.

На калгасных ячэйкі і ўсю вясковую партарганізацыю ўскладаюцца дзьве асноўныя задачы: унутрыкалгасная работа і работа на калектывізацыі адзінаасобных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, дабіваючыся суцэльнай калектывізацыі і на яе аснове поўная ліквідацыя кулацтва, як класы.

Задачы зьмены арганізацыйнай структуры і перабудовы сеткі вясковых арганізацый вымагаюць таксама правільнай расстаноўкі партыйных сіл унутры пасобных зьвеньняў арганізацыі.

У сувязі з малой колькасьцю камуністых у вясковых ячэйках, трэба, побач з вярбоўкай у партыю, зрабіць перасоўку партыйных сіл з раёнаў, акруг і цэнтру ў калгасы і сельсаветы, бо ў раённых цэнтрах звычайна сканцэнтравана да 50-60 проц. раённай арганізацыі. У паасобных выпадках можна дапусьціць разбуйненьне вялікіх сельскіх ячэек з мэтай павялічэньня сеткі. Больш мэтагодна мець ячэйку з 5-7 членаў у радыусе 5 клм., чым ячэйку з 15 чал., у радыусе 20-25 клм. Такія ячэйкі ня маюць штодзённай сувязі. Сходы адбываюцца рэдка, палітгурткі амаль ніколі ня зьбіраюцца і г. д.

Пабач з узмацненьнем унутрыпартыйнай работы, трэба палепшыць кіраўніцтва масавымі арганізацыямі на вёсцы. Таму арганізацыя фракцый пры праўленьнях калгасаў і іншых арганізацый зьяўляецца неабходнай. Толькі пры наяўнасьці гэтых фракцый, пры добрай пастаноўцы іх работы можна гаварыць аб лепшым забясьпячэньні парткіраўніцтва. Трэба, каб у справе ўзмацненьня вясковых ячэек прышлі на дапамогу арганізацыйныя групы з гораду, якія маюць вялікі практычны вопыт у рабоце.

ГАЛОДКА.

Кулаку на выгаду

Дзманіны і Аўцалупавы накіроўвалі „сваю дзейнасьць"

(КОЙДАНАЎСКІ РАЁН).

У рабоце польскага нацыянальнага калгасу імя Мархлеўскага ёсьць рад буйных недахопаў арганізацыйна - гаспадарчага пардку. Калгас арганізаваўся ў пачатку бягучага году, але асноўныя сродкі вытворчасьці больш заможных серадняко-калгасьнікаў яшчэ не абагулены. Няма належнага вучоту маемасьці, у выніку чаго ёсьць выпадкі прысваеньня ў індывідуальнае карыстаньне калгаснай маемасьці. Замест правільнага размеркаваньня малочных прадуктаў, былое праўленьне калгасу стала на шлях раздачы калгасных кароў у адзіноасобнае карыстаньне. Ініцыятарам у гэтай справе зьяўляўся былы **сакратар ячэйкі Даманін, які ў першую чаргу ўзяў з калгасу ва ўлясное карыстаньне карову.**

Былое парткіраўніцтва калгасу ў асобе сакратара ячэйкі **Даманіна** і старшыні праўленьня калгасу **Беляка** (партсьпец) дапусьцілі **прыём у калгас былых кулакоў, якія ў свой час абкладаліся сельска - гаспадарчым падаткам у індывідуальным парадку.** Таксама прынята ў калгас жонка кулака **Сідорык.** Парт'ячэйка не рэагавала на ўсе гэтыя нездаровыя зьявішчы. Прававапартуністычную лінію ячэйкі ўмела скарыстаў варожы элемэнт. Кулацкія элемэнты, якія праўзьлі ў калгас, павялі ў ім разлагаючую работу.

Аднак, зьнявіце з работы старшыні праўленьня калгасу **Беляка** за правапартуністычную практыку ў рабоце прайшло «ціха», без паданьня гэтай арганізацыйнай меры палітычнага характару. **Беляк ня быў ахарактарызаваны перад масай калгасьнікаў, як правы апартуністы-памочнік клясавага ворага.**

Апрача гэтага, райком дапусьціў грубую палітычную памылку ў тым, што своячасова **не рэагаваў на моманты скажэньня нацпалітыкі партыі** пры вырашэньні пытаньня аб калгасе імя Мархлеўскага.

Дырэктар саўгасу імя **Сталіна Аўцалупаў** (гэты саўгас мяжуецца з калгасам) рабіў розныя шкоды калгасу і **пагрозамі «сагнаць калгас у клін», дабіваўся, каб калгас упіўся ў саўгас.** Гэткія галавацяпскія мэтады «работы» папярэньня саўгасу за кошт плошчы калгасу выклікалі недавольства сярод калгасьнікаў і абвастрылі іх узаемадносіны з саўгасам.

Ня гледзячы па гэта, Аўцалупаў дамагаецца свайго. Ён дамагаецца згоды ад загадчыка зямельнай часткі РВК Жалкоўскага на права засеву саўгасам тэй зямлі, якая была ўгноена і падрыхтавана калгсам пад засеў азімага клину. Гэты ўчынак, яшчэ паглыбіў канфлікт паміж калгасам і саўгасам. Толькі скасаваньне галавацяпскіх распараджэньняў загадчыка зямельнай часткі Жалкоўскага і дырэктара саўгасу Аўцалупава папярэдзіла развал калгасу.

Койданаўскі РК КП(б)Б павінен даць ацэнку дзейнасьці паказаных асоб і прыцягнуць іх да суровай дісцыплінарнай адказнасьці. Бо яны ігнаруючы палітыку партыі ў пацтыканьні і прынцыпы добраахвотнасьці ў калгасным будаўніцтве, штурхалі калгас да развалу.

Р.

Супроць мяккацелесьці

(ЧЫРВОНАПОЛЬСКІ РАЁН)

Выдранская ячэйка КП(б)Б на чале з сакратаром Ігравым, апынуўшыся ў палоне правапартуністычных настроеў, [illegible] ігнаруючы важнейшыя дырэктывы партыі па вёсцы, на сутнасьці сарвала правядзеньне важнейшых палітычных кампаній. Пытаньнямі асенняй сяўбы, збожжазагатовак, работы сярод беднаты — ячэйка не займалася. Скаціўшыся з баявых пазыцый у балота правапартуністычнае ячэйка згубіла свой палітычны твар і аўтарытэт у масах.

Ячэйка ня толькі ня здолела замацаваць і пашырыць разгарнуць калектывізацыю ў сельсавеце, а давяла існаваньні калгас да поўнага развалу.

Як-жа рэагаваў на ўсё гэта Чырвонапольскі райком КП(б)Б?

Разьбіраючы гэту справу, райком зьняў з кіруючай работы сакратара ячэйкі Ігравага, даўшы яму суровую памову з занясеньнем у асабістую справу і гэтым абмежаваўся. Райком ня даў палітычнай ацэнкі тым недапушчальным момантам, якія захліснулі ячэйку, не папікавіўся спадчынай, пакінутай правапартуністычным кіраўніцтвам ў ячэйцы. Райком дапусьціў мяккацелесьць у барацьбе супроць правапартуністычнай практыкі, не мабілізаваў шырокіх партыйных мас на яе безьлітаснае выкарчоўваньне.

Пятр—ка.

„У росьце ня маем патрэбы"--

заяўляюць правыя капітулянты з пухавіцкай арганізацыі

Арганізацыя новага прыліву бядняцка-серадняцкіх адзіноасобных гаспадарак у калгасы—адна з асноўных задач калгаснай ячэйкі КП(б)Б. Гэта задача ў сваім практычным вырашэньні патрабуе шырокага разгортваньня масавай работы сярод беднякоў і сераднякоў адзіноасобнікаў, умепага паказу ім канкрэтных посьпехаў калектыўнае працы і перавагі калектыўных форм гаспадараньня перад адзіноасобнымі.

Рад калгасных парт'ячэек Пухавіцкага рабіну не ўсьвядомілі важнасьці гэтае задачы і нават больш таго сталі на апартуністычны шлях адносін да новага прыліву ў калгасы. Прававапартуністычныя кіраўнікі з ЯЧЭЙКІ КАМУНЫ «ЗЬВЯЗДА» ня толькі ня сталі на чале новага калгаснага прыбою, а сталі ўпоперак дарогі з мэтай прыпыніць яго. Нядаўна 6 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак падалі заявы аб прыёме ў камуну. У ПРЫЁМЕ ІМ АДМОЎЛЕНА. Чаму? Кіраўнікі камуны згодна іх заявы «ня маюць патрэбы ў большым росьце». Яны загарадзіўшыся прававапартуністычнымі рагаткамі, не зацікаўлены ў далейшым разгортваньні калектывізацыі.

Аналёгічныя факты мы маем і У КАЛГАСЕ «АВАНГАРД». Там старшыня праўленьня калгасу, ён-жа і сакратар НАВАСЕЛКАЎСКАЙ парт'ячэйкі катэгарычна адмовіўся разглядзець 7 заяў беднякоў і сераднякоў аб прыёме іх у «Авангард». 13 гаспадарак па віне апартуністых засталіся па-за калгасам. Гэта лішні раз падкрэсьлівае неабходнасьць мабілізаваць усю райпартарганізацыю на барацьбу супроць прававапартуністычнай практыкі, якая тармозіць калектывізацыю. Кіраўніцтва Пухавіцкай райпартарганізацыі павінна ўбраць з кіруючых пастоў калгаснага будаўніцтва правых апартуністых, якія стрымліваюць магутную хвалю калгаснага прыбою.

Брыгадзір ЦК ЛКСМБ Р. ІВАНЬКОЎ.

У ролі апартуністычнага наглядальніка

Хваля калгаснага руху бядняцка-серадняцкіх мас скляснела захапіла ярэйскую беднату. Тая частка ярэйскага працоўнага насельніцтва, якая пры савецкай уладзе атрымала зямельныя надзелы, на практыцы існуючых калгасаў пераканалася ў буйных перавагах калектыўнай гаспадаркі перад адзіноасобнымі. Месцаковая беднота і зьвязнае з сельскай гаспадаркай ярэйскае працоўнае насельніцтва становіцца на правільны шлях паляпшэньня свайго добрабыту—па шлях калектывізацыі. У Сялібскім сельсавеце арганізуецца нацыянальны калгас імя Калініна.

У часе арганізацыі калгасу **Сялібская парт'ячэйка не зьвярнула патрэбнай увагі на сацыяльны склад калгасьнікаў.** Гэты калгас **арганізаваўся і працуе без кіраўніцтва з боку ячэйкі.** Такое становішча скарыстоўваюць кулацкія і спекулянцкія элемэнты ў сваёй варожай дзейнасьці. Старшыня праўленьня калгасу т. **Гурэвіч**, «25-тысячнік» у сваёй рабоце ня мае падтрыманьня з боку ячэйкі і камсамольцаў-калгасьнікаў. У правядзеньні мерапрыемстваў па ўзьняцьці працыдсцыпліны ў калгасе т. Гурэвіч сустрэў актыўнае супрацьўленьне з боку адсталай часткі калгасьнікаў, а варожы элемэнт павёў у калгасе кампанію да зьняцьце яго з пасады. Ініцыятары цкаваньня т. Гурэвіча не атрымалі належнага адпору з боку ячэйкі. За час свайго існаваньня, калгас ня мае росту за лік новых адзіноасобных гаспадарак. Наадварот, ёсьць выхады з калгасу нават з боку камсамольцаў.

Сярод часткі калгасьнікаў ёсьць вельмі нездаровая тэндэнцыя **нежаданьня прымаць у калгас батракоў і беднякоў.** Вядомо, такія настроі зьяўляюцца вынікам кулацкага ўплыву на калгас.

Сялібская ячэйка не рэагавала на ўсе гэтыя нездаровыя зьявішчы, ня ніхацілася становішчам і работай калгасу, а стаяла ў баку, **у ролі прававапартуністычнага наглядальніка.**

Для аздараўленьня калгасу патрэбны рашучыя меры з боку раённага партыйніцтва.

Мясцовы.

БССР---у рыштаваньнях

Па ўдарных пабудовах

ТЭМПЫ ПАБУДОВЫ ЦЭМЭНТНАГА ЗАВОДУ—НЯ ЎДАРНЫЯ. —ПРАРЫВ НА ФАСФАРЫТНЫМ ЗАВОДЗЕ. —ТЫДЗЕНЬ ШТУРМУ НА ФАБРЫЦЫ ШТУЧНАГА ШОЎКУ

Камісія на чале з старшынёй ВСНГБ тав. **Грысевічам** 28-га верасьня прыбыла ў Крычаў.

На працягу 2-х дзён камісія знаёмілася з ходам будаўніцтва першага на Беларусі цэмэнтнага заводу і работай фасфарытнага заводу імя 1-га **Мая.**

Ня гледзячы на тое, што пабудова цэмэнтнага заводу прызнана ўдарнай, дапершэнія тэмпы работы не гарантуюць сканчэньня будаўніцтва і пуску заводу да 1-га красавіка 1931 г.

Яшчэ дагэтуль ад **«Стромстроя»** РСФСР не атрыманы чарцяжы для раду работ.

Камэрацыя ня прыняла мер, каб забясьпечыць рабочых прадуктамі, у выніку чаго нагадзяцца перабоі ў забясьпячэньні.

Тав. **Грысевіч** даў тэлеграфнае распараджэньне Лесбелу безадкладна адгрузіць для цэмэнтнага заводу 58 вагонаў піла і лесаматар'ялаў. Асінбуду прапанавана паслаць на будаўніцтва заводу 1000 пар лапцей.

У той жа дзень тав. **Грысевіч** зрабіў інфармацыю аб становішчы на будаўніцтве на нашыраным пасяджэньні райкому партыі. Крычаўскія арганізацыі абяцалі ў бліжэйшы дзень даць 200 рабочых.

29-га верасьня на тэхнічнай нарадзе ўстаноўлены дакладныя каляндарныя тэрміны сканчэньня жалезабэтонных работ на галоўным корпусе электрастанцыі і інш. будынках.

Пастаноўлена безадкладна пачаць пабудову баракаў пастаяннага тыпу на 500 чалав. Тэрмін пабудовы 10 дзён. Адказнасьць за забясьпячэньне матар'ялам, рабсілай і г. д ускладзена персональна на пасобных работнікаў.

Увечары, у рабочым клюбе адбыўся мнагалюдны сход рабочых, на якім тав. **Грысевіч** выступіў з дакладам аб значэньні цэмэнтнага заводу і аб дні ўдарніка.

* * *

На фасфарытным заводзе імя 1-га Мая, які знаходзіцца каля цэмэнтнага заводу, камісія тав. **Грысевіча** убачыла даволі сумныя малюнкі.

Завод новы і пушчаны толькі 1-га Мая 1930 г. Але работа яго носіць сэзонны характар. Выгрузка і падача руды не мэханізавана, што выклікае затрату лішняй энэргіі і г. д.

Будынак заводу не адпавядае магутнасьці абсталяваньня.

Фасфарытны завод з мая месяца не даваў рэспубліцы тысячы тон фасфарытнай мукі, якой чакалі калгасныя палі.

Замест 6 тон фасфарыту ў гадзіну, завод увесь час даваў 2,5 тон. І толькі ў верасьні адзначаецца некаторы пералом. Завод даў ужо 6 тон у гадзіну, але прарывы яшчэ далека не ліквідаваны. Сабекошт прадукцыі вельмі высокі.

Цяжкае становішча з кватарамі. Некаторыя рабочыя прымушаны спаць у лазьні, невіпскім кутку, на складзе. Пабудова баракаў значнага зацягваецца. Крычаўская кааперацыя не паладзіла абслугоўваньне рабочых.

Патрабуюцца становішча з тарай. У запасе ёсьць мяшкоў толькі на 2-3 тагоны, рэшта мяшкоў, як паведамляе заводская насьценная газэта, нагніла з-за адсутнасьці ухода за імі.

З 3-х зямсн упакоўшчыкаў працуе толькі адна. У той жа час фасфарытная мука вагонамі залежваецца ў пакгаузах і псуецца.

Сацспаборніцтва і ўдарніцтва—па-за ўрагай мясцовых партыйных і прафэсыянальных арганізацый.

На заводзе маюць месца прагулы, п'янка.

Трэба адзначыць, што дырэктар заводу—былы рабочы заводу «Камунар» тав. **Лапкоўскі** адлае шмат энэргіі і сілы, каб паставіць работу на належную высыню, але тав. **Лапкоўскі** не сустракае падтрыманьня.

Тав. **Грысевіч** даў рад загадаў на лініі Белхэмпрому і іншых арганізацый аб вылачы тэлупчаў і малака рабочым, складаньні праскуў вэнтыляцыі, мэханізацыі выгрузкі і падачы руды і г. д.

Белхэмпрому і запрапанавана ў дадзены тэрмін вырашыць пытаньне аб набыцьці ланцугоў для элевятараў, каб зьнішчыць прастой на заводзе з прычыны частых разрываў працуючых ланцугоў.

У кантрольны лічбы на 1931 год уключаюцца спэцыяльныя асыгнаваньні на жыльлёвае будаўніцтва.

* * *

30 верасьня камісія тав. **Грысевіча** абгаварыла пабудову ф-кі штучнага шоўку, завод мастаў і інш. прадпрыемствы ў Магілеве.

Будаўніцтва ф-кі шоўку ідзе ўзмоцненым тэмпам. Працуюць каля 2000 будаўнікоў.

Ёсьць затрыманьне ў рабоце, з прычыны спазьненьня заводамі «Красная труба» (Ленінград) «Красный Октябрь» (Сталінград), з-дам імя Фрунзэ (Канстанцінопуль) заказк на адгрузку жалезных газавых труб, крупнага жалеза і г. д.

Харкаўскі электрамэханічны завод, з-ды «Электросила», «Сэнкабель» адтэрмінавалі выкананьне заказаў на электрабсталяваньне.

Магналакнабуд паслаў на гэтыя заводы ўдарныя брыгады рабочых і ІТС для прасоўваньня заказаў.

Будаўніцтва мела ў мінулым месяцы рад прарываў. Для ліквідацыі прарываў быў абвешчаны стыдзень штурма». Каляндарным пляном давялі да кожнай брыгады. 305 рабочых абвясьцілі сябе мабілізаванымі на ліквідацыю прарываў.

30-га верасьня ў палацы працы адбыўся зьлёт ударнікаў, на якім рабочыя Магналакнабуду паведамілі вынікі 7-мідзённага штурму. Кожны цэх рапартаваў аб сваіх дасягненьнях.

Рабочыя высунулі сустрэчны план, у якім абавязаліся скарыць пабудову фабрыкі раней тэрміну—25-га кастрычніка, а ня 7-га лістапада.

Вытворчая праграма на выпуску шоўку да новага гасподарчага году павялічана рабочымі на 34 проц.

У тыдзень штурму лепшыя вынікі паказалі цесьляры. Арцель цесьляроў замест 30 сталоў выпусьціла 50. Заказ на спэцыяльныя шафы выкананы з перавышэньнем на 50 проц. Слупоў для ўпутрашта асьвятленьня зроблена на 70 проц. больш пляну.

Пры аглядзе заводу на выпрацоўцы мастаў аказалася, што ў некаторых месцах якасьць будаўнічых работ ня зусім здавальняючая. У адным з карпусоў часткова асела падлога.

Ахова працы пастаўлена дрэнна. Не ва ўсіх цэхах ёсьць вэнтыляцыя. Рабочым выдаюць талёны на малако, але гэтага мала яны не атрымліваюць.

* * *

У Магілеў прыехаў старшыня ўсесаюзнага Абліянкома штучнага палакна тав. **Кашкароў.**

У гутарцы з нашым спэцкорам тав. **Кашкароў** сказаў:

— З усіх фабрык штучнага палакна, якія сёлета будуюцца ў СССР, першай будзе пушчана Магілеўская фабрыка.

Цэнтральныя арганізацыі прымаюць рад мер па забясьпячэньні будаўніцтва матар'ялам, абсталяваньнем, каб пусьціць фабрыку у тэрмін. Лік рабочых маркуецца давесьці да 5000.

Увесну пачнецца пабудова рабочага пасёлку. На гэтую мэту адпушчана 1.000.000 руб. 7-га лістапада, у дзень пуску фабрыкі адбудзецца закладка новага клюбу.

М. Кін.

Асінбуд--перад пускам

(Ад нашага спэцыяльн. карэспандэнта)

2 Кастрычніка на Асінбуд прыбылі з-за мяжы часьці параправоду.

3 «Электраімпарту» атрымана паведамленьне аб тым, што 29 верасьня замежнай фірмай адгружана на Асінбуд апошнія часткі дэталяй да параправоду і іншага абсталяваньня.

3 атрыманьнем параправоду пуск Асінбуду 7 лістапада забясьпечаны.

* * *

1-га Кастрычніка ў рабочым клюбе ў Арэхах адбыўся зьлёт ударнікаў, прысьвечаны дню ударніка. Прысутнічала каля 400 чалавек.

На зьлёце былі падагуляны вынікі сацспаборніцтва і ўдарніцтва на Асінбудзе і заснукан даклад адміністрацыі Асінбуду аб перспэктывах работы.

На пабудове часовай Выдрыцкай электрастанцыі дасягнута эканомія па арэала, змазачных матар'ялах, а таксама за лік ушчыльненьня рабочага дня—25 тысяч рублёў. Вытворчы плян станцыі выкананы на 100 проц.

Па ўсім Асінбудзе плян выкананы на 97 проц., на галоўным корпусе—на 98 проц., на жыльлёвым будаўніцтве на 95 проц.

На будаўніцтве ёсьць 9 ударных брыгад рабочых і інжынэрна-тэхнічнага персаналу.

На зьлёце рабочыя высунулі сустрэчны прамфінплан, паводле якога яны абавязваюцца замест адной турбіны ў 12.000 кілёват устанавіць у 1931 г. 2 турбіны.

Група каменшчыкаў з 7 чалавек абвясьціла сябе на зьлёце ўдарнікамі і абавязалася не пакідаць Асінбуд да сканчэньня будаўніцтва ўсёй станцыі. Рабочая сталоўка № 5 выклікала на сацспаборніцтва сталоўку № 4.

На зьлёце зачытаны на чырвоную дошку 12 інжынэрна-тэхнічных работнікаў Асінбуду ў тым ліку т. т. Апейнікаў, Шаршнёў, Мзерэвіч, Чарняўскі, Клейменскінер, Рудзевскі, Іларыёнаў, Белабанаў, Цымбала, Зырын і іншыя, якія ўпачным парадкам выконалі плян будаўніцтва і мантажу станцыі.

Каля 60 рабочых-ударнікаў прэміяваны.

* * *

На Асінбуд прыбыў старшыня Белторфаб'яднаньня т. Арит для вырашэньня раду пытаньняў, зьвязаных з перадачай тарфяных балот у эксплёатацыю Белторфаб'яднаньню.

Як паведаміў нашаму спэцкору галоўны інжынэр Асінбуду т. Апейнікаў, ад выворчая праграма па здабычы торфу на 1931 г. зацьверджана ў 150.000 тон, замест 57.000 тон у 1930 г.

М. КІН.

Лебяда замест сіласных траў

Калгас **Уборкі**, Лоўскага раёну, яшчэ малады, але агідзасьцяй уже там пасьпелі нарабіць шмат. З прычыны дрэннага догляду за жывёлай, у калгасе захварэлі за 100 ніялят, шмат з іх ужо здохлі. Ня сьцяны, але сваіны: здохла шмат парасят. Хлявы вельмі брудныя, без падсьцілу.

Кароваў прыдзецца пімаваць у вельмі кепскіх умовах. Што-ж датычыць сьвіней, дык тут справа палепшацца, калі скончыцца пабудова сьвінарніка на 250 300 галоў. Сваіх кармоў калгасу бязумоўна ня хопіць, бо частка сена загінула, з прычыны несвачасовай уборкі. Замест ціматалоўкі і сіласных траў, а прычарасла прыгожая лебяда. Калгас на гэтай справе панёс 2.000 руб. страт. Раёнсаюз павінен патурбавацца, каб калгас не застаўся бяз корму.

МІХАЛ...

Мабілізацыя сродкаў насельніцтва

Крэдытная дысцыпліна—не ў пашане ў многіх арганізацый

СПЫНІЦЬ ПАРУШЭНЬНІ ЛІМІТАЎ

10.000.000 запазычанасьці Дзяржбанку.—Узносы па пазыцы—у касах установаў. Страхавыя плацяжы сабраны толькі ў разьмеры 40 проц.—Індывідуальнае абкладаньне кулацкіх гаспадарак праходзіць выключна дрэнна.—Дырэктывы аб мабілізацыі сродкаў павінны быць неадкладна выкананы.

Прарывы ў прамфінпляне--

крыніца фінансавых затрудненьняў

Увядзеньне крэдытнай рэформы мела сваёй мэтай замяніць наяўныя плацяжы безнаяўнымі разьлікамі, з аднаго боку, а з другога—укараненьне планавасьці ва ўсе вучасткі сацыялістычнага сэктару, набліжэньне банку да працэсаў вытворчасьці і, такім чынам, устанаўленьне непасрэднай сувязі банку і прадпрыемства, якое атрымлівае крэдыт.

Прадпрыемства можа атрымаць крэдыт тады, калі якасныя і колькасныя паказальнікі прамфінпляну выкананы.

Малейшае адхіленьне ад плянавых заданьняў неадкладна парушае банкаўскія ліміты, стварае фінансавую напружанасьць прадпрыемства, а пры ўмовах поўнага вычэрпаньня крэдытных лімітаў, выклікае перабоі ў выдачы зарплаты.

Барацьба з прарывамі ў прамфінпляне, барацьба за якасныя і колькасныя паказальнікі пляну зьяўляецца барацьбой за аздараўленьне фінпляну, грашовага абароту, барацьбой за своячасовую выдачу зарплаты.

За апошні час, калі ўхабы і першапачатковыя труднасьці крэдытнай рэформы нешкадзі згладжаны, калі банк можа сьпрыяльваць аб прарывах, мы маем рад фактаў, якія сьведчаць аб сур'ёзнай пагрозе ў гэтай галіне.

Парушэньні крэдытнай дысцыпліны, перавыдатканьне кіраўнікамі гаспадарчых органаў сваіх лімітаў, імкненьне пастаніць банк перад фактам прарыву, а тым самым прымусіць яго выдаць патрэбныя сумы на зарплату звыш ліміту, стала звычайным зьявішчам.

Так, напрыклад, паводле даных на 21 верасьня г. г., прамысловасьць ВСНГБ перавысіла сваю запазычанасьць Дзяржбанку на 10 млн. руб., што, на сутнасьці, зьяўляецца дадатковым націскам па эмісіі.

Розныя гандлёвыя і выдавецкія аб'яднаньні перавысілі свае ліміты на суму 1.030.000 руб.

Адначасова перавышэньне сплавала ў трэцім і першай палове чацьвертага кварталу некаторую бачнасьць фінансавага добрабыту прадпрыемстваў ВСНГБ, і толькі пасьля актыўнага выступленьня Дзяржбанку, выявіліся прарывы і фінансавая напружанасьць.

Пералічым некаторыя з іх, па тых матар'ялах, якія ёсьць у НК-РСІ БССР.

Рост прадукцыйнасьці працы, вызначаны прамфінпляном на 35 проц. на 1929-30 г., паводле арыентовачных даных, дасягне 26 проц., зьніжэньне сабекошту, замест 11 проц.—8-8,5 проц., а па Лесбеле сабекошт нават павялічыцца больш, чым на 1 проц.

Капітальнае будаўніцтва прамысловасьці ВСНГБ запраектавана і разгорнута на суму, якая перавышае вярхіні ВСНГ Саюзу на 6 млн. руб.

Па Белхэмаб'яднаньні, у выніку неданыкананьня якасных паказальнікаў, чакаецца зьніжэньне прыбыткаў на суму да 60.000 руб., падаражаньне сабекошту фасфарытнай мукі і невыкананьне праграмы па крэйдзе складае прарыў у суме, прыблізна, 70.000 руб., нездавальняючая рацыяналізацыя вытворчых працэсаў пагражае стварэньнем лішніх запасаў руды на суму да 25.000 руб.

Разам з іншымі прарывамі ў прамфінпляне, можа быць агульны прарыў па суму да 200.000 руб.

Большкловаб'яднаньне, паводле зацьверджанага ВСНГБ пляну, разгарнула капітальнае будаўніцтва з перавышэньнем супроць пляну ВСНГ Саюзу па суму 1.659.000 руб., уклаўшы ў яго 900.000 руб. уласных зваротных сродкаў.

Калі ўлічыць іншыя выяўцы сродкаў і прыбытак, які чакаецца ў Белшкловаб'яднаньні, дык у канчатковым выніку ўласныя зваротныя сродкі зьменшацца на 500.000 руб.

Белснураб'яднаньне ня выканала кантрольных заданьняў па якасных і колькасных паказальніках: сабекошт за 9 месяцаў зьніжаны, замест 11 проц.,—на 5,6 проц., а ў трацім квартале пры заданьні ў 14 проц.—на 6,15 проц.; выкананьне вытворчай праграмы па абутку —84,9 проц., а ў гранох—78,8 проц.

Асабліва трэба спыніцца на **гомельскай фабрыцы «Праца».** За 9 месяцаў фабрыка недавыпрацавала 100.000 пар абутку. Замест 70-80 проц. абутку першага гатунку фабрыка выпусьціла—10-15 проц. У выніку толькі ў адносінах розьніцы гатункаў страты за 12 дзён жніўня складалі 27.000 руб.; загатовачны цэх выпускае 2,5 тыс. пар загатовак у суткі, у той час, як пашывачны цэх выпускае ў суткі 1.200 пар. У выніку мы маем накапленьне паўфабрыкатаў да 500.000 пар.

Белшвэйаб'яднаньне разгортвае капітальнае будаўніцтва з перавышэньнем кантрольных сумы ВСНГ Саюзу на 950.000 руб.

Белдзяржгандаль частку кароткатэрміновых крэдытаў, прызначаных пляном Дзяржбанку на загатоўку пераробку, экспэдыцыю сырцу, у суме 417.000 руб., выкарыстаў на пабудову чацьвертага паверху свайго дому і складу.

Разам-жа з іншымі перавыдаткамі. Белдзяржгандаль укладзае ў капітальнае будаўніцтва кароткатэрміновыя крэдыты ў суме 711.000 руб.

Гэта ўжо ня толькі прарыў—гэта злачынства, якое патрабуе суровага пакараньня.

Уся наша грамадзянасьць 1, у першую чаргу, рабочыя масы, павінны рашуча змагацца з прарывамі ў прамфінпляне, як крыніцаю нашых затрудненьняў.

С. ПАЎТАРЖЫЦКІ.

Індывідуальнае абкладаньне зрываецца

20 РВК не „заўважылі" кулакоў

Лічбы паказваюць, што індывідуальнае абкладаньне с.-г. падаткам кулацкіх гаспадарак па БССР правалена. З 69 раёнаў, ад якіх атрыманы весткі, 20 РВК не насароміліся афіцыяльна заявіць, што ў іх кулакоў няма і абкладваць індывідуальна няма каго. Вось сьпіс тых раёнаў: Асіпавіцкі, Бешанковіцкі, Баравіцкі, Баркавіцкі, Жлобінскі, Журавіцкі, Каралінскі, Клімавіцкі, Крычаўскі, Лёзьнянскі, Лепельскі, Нараўлянскі, Парыцкі, Прапойскі, Сеньненскі, Сіроцінскі, Сьмілавіцкі, Талачынскі, Хойніцкі і Юравіцкі.

У той час, як мы паглядаем рост актыўнасьці кулацтва, яго спробы сарваць калектывізацыю, загатоўкі, рэалізацыю навіны, — некаторыя раённыя арганізацыі супакоіліся на думцы, што «клясавая барацьба скончана».

Выявіўшы на некалькі кулацкіх гаспадарак, іншыя РВК чакаюць, пакуль кулакі самі прыдуць унесьці падатак. Падатак трэба было сагнаць поўнасьцю ў другой палове верасьня, між тым па 13 раёнах кулакі на 21 верасьня заплацілі толькі 32 проц. падатку.

Па Хойніцкім, Койданаўскім, Дубровенскім, Бярэзінскім, Коханаўскім і Суразск

Добрая ініцыятыва ў бюракратычных ціскох

Патрабаваньні ўдарнікаў аб арганізацыі вытворчых манэўраў натыкаюцца на раўнадушша прафчыноўнікаў

Фабзаўкомы „Камунара", „Энэргіі", „Дрэвапрацоўшчыка" і шчотачнай фабрыкі абмежаваліся вылучэньнем штабаў

ШМАТТЫРАЖКІ „КАМУНАРА" І ШЧОТАЧНАЙ ФАБРЫКІ ПРАХОДЗЯЦЬ МІМА МАНЭЎРАЎ

Моцна ўдарыць па заводзкіх апартуністых, якія зрываюць падрыхтоўку да трэцяга рашаючага году пяцігодкі

Менш трасканні, бліжэй да справы

Калі-ж пачнуцца вытворчыя манэўры на „Камунары"?

Завод «Камунар» 21 верасьня сканчыў выкананьне гадавой праграмы. Да 1-га кастрычніка праграма была выканана на 103,03 проц. Дасягненьні вялікія. Але ці ж гэта МАКСЫМУМ таго, што мог даць завод?

«Зьвязда» ня раз падкрэсьлівала, што «Камунар» пры лепшым кіраўніцтве можа дабіцца значна большых посьпехаў. Да працягу ўсяго году «Зьвязда» ня раз выяўляла шматлікія вытворчыя недахопы на «Камунары» і патрабавала іх ліквідацыі.

На пароге ўдарнага кварталу «Камунар» павінен быў ДОБРА ПРАВЕРЫЦЬ ВАЮ ПАДРЫХТАВАНАСЬЦЬ ДА ВЫКАНАНЬНЯ АДКАЗНЫХ ЗАДАЧ, ЯКІЯ СКЛАДЗЕНЫ НА ЯГО ПАРТЫЯЙ І РАБОЧАЙ КЛЯСАЙ. Тым больш, што ніякі прапрацоўкі кантрольных лічбаў пяцігодкі і складаньне суправчнага прамфінпляну гэтым адказным задачы ПАВЯЛІЧЫЛІ. Сустрэчны прамфінплян павялічыў кантрольныя лічбы на 39,6 проц., або на 1.928 тысяч руб. проць 5.699 тыс. руб., вызначаных на 1930-31 гаспадарчы год. Зараз, калі гаспадарчы год пачнецца з 1 студзеня 1931 г. і завод атрымаў на ўдарны трохмесячнік асобную праграму, трэба дабіцца ня толькі захаваньня вызначаных сустрэчным тэмпаў, але ГЭТЫЯ ТЭМПЫ ПАВЯЛІЧЫЦЬ.

Між тым, на заводзе ёсьць работнікі абслугоўчага складу, якія вельмі пасьмяшна глядзяць на рэальнасьць сустрэчнага прамфінпляну. Ім здаецца, што сустрэчны прамфінплян, СКЛАДЗЕНЫ САМІМІ РАБОЧЫМІ,—узяты «з паветра». Сказаць аб гэтым адкрыта яны баяцца, але ў прыватных гутарках ды імкнуцца пасеяць такое мяркаваньне спрод рабочых.

Здавалася-б, каб рашуча ўдарыць па такіх апартуністычных настроях пасадовых работнікаў і давесьці на справе поўную рэальнасьць выкананьня сустрэчнага прамфінпляну, заводзкім арганізацыям, У ПЕРШУЮ ЧАРГУ ЗАЎКОМУ, трэба было цалкам ужыць дасканалую ініцыятыву гомельскіх друкароў і арганізаваць ВЫТВОРЧЫЯ МАНЭЎРЫ. Апошнія тансама далі-б магчымасьць выявіць і зьнішчыць наяўныя недахопы і мабілізаваць усе ўнутраныя скрытыя рэсурсы.

Як-жа на «Камунары» падышлі да гэтае справы? Фармальна пытаньне аб вытворчых манэўрах ставілася на бюро парткалектыву. Вылучылі штаб. На чале яго паставілі загадчыка вытворчага сэктару заўкому тав. ГОБЭРМАНА. Але наколькі тав. Гобэрман цікавіцца манэўрамі, відаць з таго, што ён нават НЯ ВЕДАЕ, колькі чалавек вылучана ў штаб кіраўніцтва манэўрамі.

— Калі-ж пачне працаваць штаб?

— Пасьля канфэрэнцыі ўдарнікаў, на якой штаб будзе зацьверджаны,—кажа тав. Гобэрман.

— А калі будзе канфэрэнцыя?

— АБ ГЭТЫМ МЫ ЯШЧЭ НЕ ДАГАВАРЫЛІСЯ,—адказвае тав. Гобэрман.

Зразумела, паколькі штаб яшчэ не «зацьверджаны», пляну работы ў яго няма.

— Навошта нам плян?—пытаецца сакратар парткалектыву тов. Эйдэльбэрг.—Нам бюракратычнай пісаніны ня трэба, мы супроць гэтага...

Наконт дзвядзеньня прамфінпляну ўдарнага кварталу да кожнага варштату, тав. Гобэрман дае станоўчы адказ, а тав. Эйдэльбэрг—адмоўны. Па словах апошняга, прамфінплян дзведзены толькі да цэхаў.

Пытаньне аб манэўрах на пасяджэньні заўкому яшчэ НЕ СТАЯЛА. Рабочыя поўнасьцю не ўсьвядомілі значэньня манэўраў. Заводзкая газэта «Камунаравец», якая павінна была ЎЗЬНЯЦЬ ПЫТАНЬНЕ АБ МАНЭЎРАХ НА ПРЫНЦЫПОВА ПАЛІТЫЧНУЮ ВЫШЫНЮ І МАБІЛІЗАВАЦЬ РАБОЧЫХ НА ПРАКТЫЧНАЕ АЖЫЦЬЦЯЎЛЕНЬНЕ ГЭТАЙ ІДЭІ, у апошнім нумары, як і ў папярэднім, ні адным словам не закранула пытаньня аб манэўрах.

Ну, пагаварылі, ну, штаб выпучылі—на гэтым справа і спынілася...

Так рыхтавацца да выкананьня адказных задач ударнага трохмесячніку і трэцяга году пяцігодкі нельга. 730 УДАРНІКАЎ «Камунара» павінны дабіцца рашучага пералому ў гэтай справе і патрабаваць ад сваіх кіраўнікоў узмацненьня кіраўніцтва.

АЛЕСЬ.

Тав. Льбудь прэм'яваны, як лепшы ўдарнік

Астыглі на трэці дзень

Вытворчыя манэўры на заводзе «Дрэвапрацоўшчык» павінны былі пачацца 23 верасьня. Быў абраны штаб з 10-ці чалавек, апрача таго, у кожным цэху па 2 чал. Камсамольскі калектыў мабілізаваў 20 камсамольцаў для збору прапаноў рабочых. І з першых дзён штаб горача ўзяўся за работу. Але штаб не разабраўся ў мэханіцы арганізацыі вытворчых манэўраў. Замест шырокай мабілізацыі рабочага калектыву, уцягненьня ў манэўры пітаральна ўсіх рабочых, замест арганізацыі рабочай ініцыятывы на выяўленьне вытворчых недахопаў і захаваных унутраных рэсурсаў,—штаб сам кінуўся выяўляць асобныя недахопы па цэхах. Але што можа зрабіць штаб бяз арміі?

Штаб выявіў, што для лесацэху не хапае сырцу. Намесьнік упаўнаважанага шляхаў зносін т. Леднік абяцаў адгружаць патрэбную колькасьць лесу. Пакуль што адгрузка лесу ідзе паставому. У мэханічным цэху ўдарнікі Гецаў і Пашкоў сыстэматычна рабілі брак. Штаб кіраўніцтва манэўрамі патрабаваў ад заводзкіх арганізацый рашучых мер супроць браку.

Вось і ўся работа штабу. Пасьля гэтага штаб пераныў адпачыць. І наколькі ні ад заўкому, ні ад парткалектыву ніякіх напамінаньняў не было, штаб адпачывае і да сёньняшняга дня.

Старшыня заўкому тав. Кацман аб вытворчых манэўрах нічога ня ведае.

Сакратар парткалектыву тав. Шаўкавец (праўда, новы работнік) адкрыта прызнаўся, што «вось ужо з лні як я гэтай справай ня цікаўлюся, бо ёсьць людзі, якія павінны кіраваць манэўрамі».

Паводле слоў таго-ж Шаўкаўца, у штабе кіраўніцтва манэўрамі ёсьць шмат прапаноў рабочых, але яны яшчэ не разгледжаны.

Дырэктар заводу тав. Грушнеўскі на пытаньне, што далі вытворчыя манэўры, адказвае: «Вельмі шмат». А канкрэтна? Канкрэтна тав. Грушнеўскі адказаць ня мог.

Увесь трыкутнік спадзяецца на тое, што манэўры пройдуць як небудзь бяз яго ўдзелу. Ня дзіва, што да сёньняшняга дня ні адзін чалавек не запісаўся ў брыгады энтузіястых, якія арганізуе штаб манэўраў. Тлумачыцца гэта тым, што рабочыя аб значэньні і мэтах манэўраў нічога ня ведаюць.

Вось як аматары парадняньні і барабаннага бою даводзяць пачатую справу да канца.

А. М.

Міма галоўнага

Заўком „Энэргіі" ў боку ад манэўраў

Афіцыйна энэргаўцы ўключыліся ў вытворчыя манэўры 22 верасьня. Яны на ўсіх прадпрыемствах, быў створаны агульна-заводзкі штаб, распрацаваны плян...

Штаб ня сустрэў ніякай дапамогі ні з боку заўкому, так і з боку парткалектыву. Заўком, мусіць, парашыў ня ўмешвацца ў гэту справу. Недарма некаторыя члены заўкому (як Карначоў і інш.) некалькі раз заўважылі, што «манэўры—непатрэбная справа і ніякай карысьці яны не дадуць.

Пытаньне аб манэўрах нават ня было абмеркавана на пасяджэньні заўкому.

Для большай пасьпяховасьці манэўраў трэба было шырока разгарнуць самакантрактацыю рабочых. Але заўком не пакланаціўся вылучыць адказных асоб для афармленьня заяў рабочых аб самакантрактацыі. Такім чынам, з усяго калектыву каля 1.500 чалавек афармлена толькі 386 самаабавязацельстваў. Калі ўлічыць, што завод «Энэргія» зьяўляецца ініцыятарам самакантрактацыі рабочых і што на некаторых прадпрыемствах процант самакантрактацыі значна больш, будзе ясна, як мала прароблена ў гэтым напрамку на «Энэргіі».

Заводакіраўніцтва таксама манэўрамі ня цікавіцца. Да гэтага часу няма кантрольных лічбаў на ўдарны квартал. Гэта пазбаўляе рабочых магчымасьці складзі сустрэчны прамфінплян. Заўком адміністрацыю не падганяе.

Ні заўком, ні адміністрацыя ня выканалі дырэктывы бюро парткалектыву аб іх удзеле ў вытворчых манэўрах.

Трэба падкрэсьліць, што рабочая маса «Энэргіі» вельмі зацікаўлена вытворчымі манэўрамі. На ўсіх сходах рабочыя выступаюць і вітаюць гэтае добрае пачынаньне. Рабочыя абяцаюць паказаць сапраўдныя бальшавіцкія тэмпы ў часе манэўраў.

Заводзкія арганізацыі павінны пасьпяшаць.

Л.

Многія фабрыкі і заводы—без кантрольных лічбаў

Шклоаб'яднаньне і Беллапера не сьпяшаюцца

Даць неадкладна праграмы прадпрыемствам

Шклоаб'яднаньне да гэтага часу нічога не зрабіла для таго, каб забясьпечыць свае заводы плянамі на ўдарны трохмесячнік. У плянавым аддзеле разводзяць рукамі. «Сустрэчны прамфінплян на 1930-31 год прапрацаваны, у ім ёсьць квартальныя праграмы, няхай і працуюць». Паводле думкі плянавікоў з аб'яднаньня, пляны складзены максымальныя (?), больш ванныя печы шкла не дадуць (!), навошта яшчэ патрэбен сустрэчны прамфінплян?

Ня лепш і ў папертрэсьце. Толькі ўчора паслалі прадпрыемствам плян першага кварталу, які быў выпрацаваны па 1930-31 год.

Лесбел ўчора атрымаў ад Саюзлесу тэлеграфнае заданьне па загатоўках і расьніцоўцы драўніны. Саюзлес абяцаў тэрмінова выслаць падрабязны плян на трохмесячнік. Плян да гэтага часу не атрыман. Плянавы аддзел сам разьмеркаваў на заводах і вучастках заданьні і перадаў тэлеграфна месцам.

Запалкавае аб'яднаньне пасьля апублікаваньня пастановы аб перанясоньні гаспадарчага году, зараз-жа прыступіла да складаньня праграмы на ўдарны трохмесячнік. 28-га верасьня фабрыкам была разасланая праграма працы фабрык па кастрычнік-сьнежань. Плян прадугледжвае павялічэньне выпрацоўкі запалак супроць заданьня «Всесоюзпромсоюзу» на 70.000 скрынь.

Ф.

Тав. Дарафеяў прэм'яваны, як лепшы ўдарнік

„Чырвоны Кастрычнік" ліквідаваў прарыў

Цьвіковы завод «Чырвоны Кастрычнік» (ля Воршы) поўнасьцю выканаў прамфінплян другога году пяцігодкі. Да 1-га кастрычніка завод сваю праграму значна перавыканае. Гэтым посьпехам спрыяла мабілізацыя актыўнасьці ўсяго калектыву пасьля адозвы ЦК. Для ліквідацыі прарыву частка рабочых майстроў адмовілася ад чарговага водпуску. Увесь партыйны і камсамольскі калектыў далі абавязацельствы не пакідаць заводу да канца пяцігодкі. Іх прыкладу пасьледавалі многія беспартыйныя рабочыя.

Работу каапэрацыі пад масавы рабочы кантроль

На нарадзе пры ЦК КП(б)Б

Бюро ЦК КП(б)Б у сваёй пастанове ад 16 верасьня адзначыла, што прарывы ў рабоце спажывецкай каапэрацыі БССР у значнай меры тлумачацца адсутнасьцю масавага рабочага кантролю над працай каапэрацыі.

Выходзячы з гэтага, ЦК КП(б)Б прапанаваў усім партыйным і прафэсыянальным арганізацыям ажыцьцявіць пастанову ЦК УсеКП(б) аб масавым рабочым кантролі над працай спажывецкай каапэрацыі.

Здаецца, дырэктывы партыі павінны былі быць сыгналам для ўсіх прафэсыянальных і партыйных арганізацый. На нарадзе, пры аддзеле масавых кампаній ЦК КП(б)Б, з удзелам прадстаўнікоў прафсаюзаў і спажывецкай каапэрацыі выявілася, што ні ЦСПСБ, ні Белкаапсаюз, ні друк не аддалі гэтай важнейшай справе патрэбнай увагі. ЦК ЛКСМБ не знайшоў нават патрэбным паслаць свайго прадстаўніка на гэту нараду.

Паасобныя парткалектывы недаацэньваюць значэньня гэтага пытаньня. Так, на завод «Энэргія» прышоў прадстаўнік МЦРК дагаварыцца з сакратаром парткалектыву і старшынёй заўкому аб скліканьні сходу рабочых для азнаямленьня апошніх з арганізацыяй закрытых разьмеркавальнікаў. На гэта сакратар парткалектыву адказаў:

— Ідзеце самі і склікайце сход.

Белкаапсаюз абмежаваўся тым, што паслаў тэлеграмы раённым арганізацыям з прапановай абвясьціць сябе ўдарнікамі па правядзеньні гэтае кампаніі. Паогул, па думцы прадстаўніка Белкаапсаюзу, толькі друк павінен мабілізаваць увагу рабочых. Шэфства фабрык і заводаў над работай каапэрацыйных арганізацый таксама слаба праводзіцца. Вылучэньне перадавых рабочых ударнікаў у каапэрацыйны апарат ідзе вельмі марудна.

10 ДЗЁН ТЭРМІНУ

Адкрыць разьмеркавальнікі і рамонтныя майстэрні

Бюро Фрунзаўскага РК партыі абмяркоўвала пытаньне аб выкананьні МЦРК дырэктыў па рабочым забясьпячэньні і грамадзкім харчаваньні. Пастановы бюро РК ад 28 жніўня МЦРК у асноўным ня выкананы. МЦРК не перабудаваў сваёй работы ў адпаведнасьці з адозвай ЦК УсеКП(б).

Бюро Фрунзаўскага РК ўхваліла рад пастаноў адносна далейшай работы МЦРК. У 10-дзённы тэрмін на больш буйных прадпрыемствах раёну павінны быць адкрыты зачыненыя разьмеркавальнікі і рамонтныя майстэрні. 20 лепшых рабочых-ударнікаў будуць накіраваны на работу ў галіне грамадзкага харчаваньня.

У зьвязку з тым, што ўборка ўраджаю ў прыгарадных гаспадарках знаходзіцца пад пагрозай, бюро пастанавіла мабілізаваць на 5 дзён 600 студэнтаў для ўборкі ўраджаю прыгарадных гаспадарак.

Праз 20 дзён бюро райкому зноў заслухае даклад МЦРК аб выкананьні дадзеных яму дырэктыў.

МЭРОВІЧ.

Лятунам і дэзэртырам—ня месца ў саюзе

Прэзыдыум Беларускага рэспубліканскага камітэту саюзу сельгаслесарабочых гэтымі днямі абгаварыў пытаньне аб агранамах-лятунах і дэзэртырах.

Аграном Суздалеў з Магілёўскага паляводсаюзу адмовіўся працаваць за 200 руб., патрабуючы 250.

Аграном Тэрасаў з Гомельскага паляводсаюзу катэгарычна адмовіўся ехаць у раён, заявіўшы: «Пры такіх парадках вы страціце ўсіх спэцыялістых».

Паспаная ў Барысаўскі раён жывёлавод Менскага малжывёлаводсаюзу Інтарэсава апынулася на рабоце ў Горацкім раёне.

Аграном-плянавік Расонскага раёну Бутквевіч узяў водпуск і, не пасьпеўшы ад'ехаць некалькі станцый ад Расон, напісаў заяву аб звальненьні.

Назначаная ў Расонскі раён аграном Ярышка (з Полацкага акрэа) недзе зьнікла.

Аграном-арганізатар Пэўзнэр ужо калі месяца едзе на работу ў Рагачоў.

У выніку далёкія раёны (Камарына, Расоны і інш.) амаль не ўкамплектаваны, у той час, як у былых акруговых цэнтрах засталося шмат спэцыялістых.

Прэзыдыум Беларускага камітэту саюзу падкрэсьліў недапушчальнасьць такога зьявішча, калі асобныя гаспадарчыя арганізацыі, замест барацьбы з «лятунамі» і дэзэртырамі, замест таго, каб байкатаваць гэтых дэзэртыраў, займаюцца пераманьваньнем, іх абаронай. Прэзыдыум пастанавіў выключыць з радоў саюзу за шкоднае дэзэртырства і рвацтва агранамаў Тарасава і Інтарэсава.

М. С.

Гульня з „сустрэчным"

...ная рэч атрымалася ў часе працы кантрольных лічбаў трэцяга пяцігодкі па лесацэху бабруйскага заводу. Кантрольная лічба была спланавана ў 45 кбм. па рамах. Рабочыя высунулі свой сустрэчны ў 48 кбм. Тады «плянавікі» ...чамусьці павялічылі сустрэчны да 49,6 кбм. Здавалася, ...ому ўчынку цяжка падшукаць. Але аказваецца, што фактычная выпрацоўка лесацэху складае 53 кбм. на зьмену і ні адна з вышэй названых лічбаў не адпавядае сапраўднасьці.

Чаму-ж гэта так атрымалася? Хто вінаваты ў гэтай агіднай справе?

Вінаваты некаторыя «ліпавыя» спэцыялістыя, якія сядзяць у плянавых органах бабруйскага камбінату. Гэта—браты Гурэвічы, якія больш мараць аб павялічэньні пэнсіі, чым аб інтарэсах камбінату. І сапраўды, навошта былому ўласьніку лесазаводу Гурэвічу Б. М. цікавіцца бальшавіцкімі тэмпамі будаўніцтва?

Праўда, ён займае пасаду загадчыка камэрцыйнай часткі камбінату, але гэтая пасада яго ні да чаго не абавязвае. Брат яго кіруе плянавай часткай камбінату і адносіцца да сваіх абавязкаў таксама фармальна.

Недарма прадстаўнік Саюзлеспрому заявіў на вытворчай нарадзе: «Вам, гр-н Гурэвіч, з вашым сьветапоглядам і палітычнай ідэалёгіяй—не сядзець у камбінаце і плянаваць». Гэта так і ёсьць.

Толькі апартуністычна-недальнабачныя кіраўнікі аб'яднаньня і камбінату могуць дапускаць такое «плянаваньне» кантрольных лічбаў.

Рабочая маса, ударнікі і заводзкія арганізацыі камбінату павінны хутчэй мабілізавацца на барацьбу з апартуністычнымі настроямі сваіх кіраўнікоў і дабіцца сапраўдных бальшавіцкіх тэмпаў у рабоце.

Брыгада «Зьвязды»

С. Каган, А. Манькоў.

МАСА НЯ УЦЯГНУТА

НА ШЧОТАЧНАЙ ФАБРЫЦЫ ІМЯ КРУПСКАЙ ДА МАНЭЎРАЎ ЯШЧЭ «РЫХТУЮЦЦА»

Ганебнае маўчаньне фабрычнай шматтыражкі

Шчотачная фабрыка імя Крупскай пачалася ў вытворчыя манэўры 23 верасьня. У той-жа дзень быў абраны штаб. Але пачалі варушыцца толькі праз тры дні. Пакуль што падрыхтоўка да манэўраў посіць выключна канцэлярскі характар. Рыхтуюцца розныя карткі, анкеты і г. д.

Рабочая маса яшчэ стаіць у баку. Увесь час ад 23 верасьня заўком склікаў ні аднаго сходу рабочых, прысьвечанага манэўрам. Манэўрамі ...ны толькі брыгады, якія пашыраюць спрод рабочых распрацаваныя ...ы. Штаб кіраўніцтва манэўрамі ...чна яшчэ ня вышаў з габінэту ...ці. Ці не з тае прычыны, што на штабу стаіць дырэктар фабрыкі? Сакратар...а, што нумар фабрычнай ...тыражкі «Рэха працы» ад 3 кастрычніка (№ 1) моўчкі абыходзіць пытаньне аб манэўрах. Ні ў адозьве трыкутніка, ні ў перадавіцы аб задачах прадпрыемства, ні ў артыкулах—**няма ні слова аб вытворчых манэўрах.**

Нават у паведамленьні аб паступным нумары шматтыражкі рэдкалегія просіць рабкораў пісаць толькі на наступныя тэмы: 1) аб калдагаворнай кампаніі, 2) аб працы сацыяльна-бытавога сэктару і 3) рознае. **Рэдкалегія праходзіць міма важнейшага пачынаньня прадпрыемства.**

Усіх гэтых недахопаў ня было-б, **калі-б фабком больш цікавіўся манэўрамі.** Вылучыўшы члена фабкома ў штаб, фабком ў цэлым па гэтым супакоіўся, спадзяючыся, што штаб зробіць усё, між тым, як арганізацыя вытворчых манэўраў патрабуе напружанай работы **ўсяго трыкутніка і рабочае масы.**

Арганізацыю вытворчых манэўраў трэба перавесьці на сапраўдныя бальшавіцкія тэмпы.

Яз. С-ны.



Ерэмэн прэм'яваны, як лепшы ўдарнік

За савецкае дырыжаблябудаўніцтва

Уносяць і выклікаюць

...работнікаў БСІКА ўнесла на дырыжаблябудаўніцтва імя «Правды» 34 ...

...ніці Лёзьненскага РК, РВК і ...носяць 22 руб. у фонд пабудовы ...блёта імя газэты «Правда» і выклікаюць гарадоцкіх і сурасніх работнікаў РК і РВК.

...легія насьцягазэты і бюро ячэйкі ...Б 2-й Менскай савецкай больніцы ...носяць у фонд савецкага дырыжаблябудаўніцтва 25 руб. і выклікаюць ...гію насьцягазэты і бюро ячэйкі ...Менскай 1-й савецкай больніцы.

...рускі Дзяржаўны Вандроўны ...ў «Дзень ударніка» паладзіў канцэрт якога сабрана 150 руб. Частка ...іх як: Рэйт, Ліпніцкі, Лучонак і ...ці ушесьлі ў фонд пабудовы дырыжабля «Правды» паладзіўшы ім частковых грошай.

Супрацоўнікі Талачынскага РК КП(б)Б і КСМ сабралі ў фонд дырыжаблябудаўніцтва 118 руб. і выклікаюць пасьледваць іх прыкладу наступныя РК КП(б)Б: Горацкі, Мсьціслаўскі, Дубровенскі, Аршанскі, Копыскі і Жлобінскі.

Сакратар Клічаўскага РК КП(б)Б і старшыня РВК уносяць па 8 руб. у фонд дырыжаблябудаўніцтва і выклікаюць усіх сакратароў РК КП(б)Б і старшынь РВК раёнаў б. Бабруйскай акругі: Астолькера, Нікіфарава, Цішкевіча, Жукоўскага, Брэля, Аўсеенка, Казачка, Ражкова, Марчанка, Лук'янава, Хіжынкава, Урублеўскага, Сташэўскага, Антонава, Фалейчыка, Купрэева, Зяпёнку, Гарбачова, Грышчанка, Нахільніцкага, Цецярука, Халуткова, Шакалаціцкага, а таксама дырэктароў саўгасаў ва, а таксама дырэктараў саўгасаў т. т.: Лапко, Дэрмана, Еўдакімава, Трызну і Клімова.

АПАРТУНІСТЫЧНЫ СПАКОЙ І АДМІНІСТРАЦЫЙНЫЯ ПЕРАГІБЫ

Ход збожжазагатовак па радзе раёнаў выклікае сур'ёзны пенакой. У радзе раёнаў маюць месца апартуністычная бяздзейнасьць і голае адміністраваньне.

Посьпяхі давядзеньне плянаў збожжазагатовак да вёскі, па Дрыбінскім раёне і неабходнасьць у сувязі з гэтым «нагнаць улушчанае», штурхнула мясцовых работнікаў на шлях адміністраваньня; замест растлумачальнай работы, замест работы з беднатой, дапушчаны перагібы ў адносінах давядзеньня кантрольных лічбаў да наасобных двароў.

У Прапойскім раёне, мясцовыя сельскія арганізацыі не аказваюць ніякага арганізуючага ўплыву на здачу збожжа, — не праводзяць нават сходаў, не адкалькулюцца кампаніяй самаабавязацельстваў і г. д. «Самі адыдзіце»—вось «лозунг» курс збожжазагатовачага апарату ў радзе сельсаветаў Прапойскага раёну. Адсюль бязмоўнае — рэальная пагроза выкананьню плану.

У тым-жа Прапойскім раёне праяўляюцца зусім злачынна «благадушныя» адносіны да кулацкіх гаспадарак. Досыць паказаць, што дагэтуль яшчэ не пераданы цьвёрдыя заданьні на здачу збожжа кулацкім гаспадаркам. Ня прыходзіцца даводзіць палітычную шкоднасьць і памылковасьць аргумэнтацыі некаторых мясцовых работнікаў аб тым, што «кулака ня няма». Гэтыя разважаньні нельзя інакш кваліфікаваць, як яскравую правапартуністычную практыку.

У Прапойскім-жа раёне некаторыя калгасы недапушчальна марудзяць выконваюць свае абавязкі перад дзяржавай. Гэта ў значнай ступені моцна тлумачыць самацёчнымі настроямі мясцовых арганізацый, якія ня прынялі ніякіх мер да выцяненьня таварных ліпкаў хлеба па калгасным сэктары.

Кастрычнік павінен стаць месяцам рашучага пералому і ліквідацыі перагібаў. У нас ёсьць магчымасьць ня толькі дасягнуць выкананьня збожжазагатоўчага плану, але і для яго перавыкананьня. Але гэта можа быць вырашана толькі пры самым рашучай барацьбе як з правапартуністычнай стаўкай на самацёк, так і з ...вамі «левацкіх» загібаў.

В. Адлярштэйн

Кастрычнік—рашаючы месяц загатовак

12,000 ТОН ЗДАВАЦЬ У КОЖНУЮ ПЯЦІДНЕЎКУ---

задача ўсёй грамадзкасьці і загатоўчага апарату

122,2 проц. месячнага заданьня

—выкік верасьнеўскіх загатовак

1-га кастрычніка закончыўся першы квартал бягучай збожжазагатоўчай кампаніі. Кампанія ўсюды ўступіла ў рашаючую фазу свайго разьвіцьця. Таму вынікі верасьнёўскіх, а разам з тым і квартальных загатовак, зьяўляюцца асабліва паказальнікі, асабліва павучальнымі.

У апошнюю пяцідзённую верасьня загатоўлена 7.240 тон або 30,4 проц. месячнага заданьня. Усяго за верасень загатоўлена 29.043 тоны, або 122 проц. месячнага заданьня.

З пачатку кампаніі за мінулы квартал загатоўлена 32.115 тон або 111,8 проц. квартальнага пляну.

Гадавы плян збожжазагатовак за першы квартал выкананы на 23,4 проц.

Усё яшчэ вельмі марудна выконваюць свае заданьні САЎГАСЫ. Перапому яшчэ няма. За апошнюю пяцідзённую саўгасамі здана ня больш, чым у папярэднюю пяцідзённую. Усяго саўгасамі ў верасьні месячны плян выкананы на 22,5 проц., квартальны на 19 проц. і гадавы на 10,7 проц.

Калгасы за апошнюю пяцідзённую ня толькі не ўзмацнілі тэмпаў здачы збожжа, а наадварот нагнядаецца зьніжэньне процанту выкананьня. У апошнюю пяцідзённую калгасы здалі толькі палову таго збожжа, якое было здана ў папярэднюю пяцідзённую (1.024 тоны ў пятую пяцідзённую—593 тоны—у шостую).

Месячны плян загатовак калгасамі выкананы толькі на 85,9 проц., квартальны—на 94,8 і гадавы—на 17 проц.

Ня гледзячы на ўсе труднасьці, якія ёсьць пры абмалоце, бязмоўна, калгасное збожжа магло быць здана дзяржаве ў значна большых разьмерах. Неабходна было толькі своячасова правесьці сапраўдную масавую растлумачальную работу. Трэба было растлумачыць калгаснікам неабходнасьць здачы збожжа дзяржаве адразу з малаціпак.

У тых мясцох, дзе партыйныя і збожжазагатоўчыя арганізацыі такую работу правялі, калгасы ідуць на першым метоўчай кампаніі.

Працягваем самаправерку жывёлагадоўлі ў саўгасах і калгасах,

КАЛГАСНАЯ ДАПАМОГА РАБОЧЫМ ЦЭНТРАМ

Калгас „Праца" з'эканоміў 32 цялят для забесьпячэньня рабочых

БАРЫСАЎСКАЯ ФЭРМА—ФАБРЫКА ГАРОДНІНЫ І МАЛАКА

Калгасы і саўгасы БССР, бярэце прыклад з калгасу „Праца"

Сьвінарнік на Барысаўскай прыгараднай фэрме МЦРК.

У АДКАЗ НА ШКОДНІЦТВА РАЗАНЦАВЫХ

Адкрыты ліст рэдакцыі газэты „Зьвязда"

Мы, прадстаўнікі аднаго з тысяч калгасаў, якія вырасьлі ў часе вясеньняй бальшавіцкай сяўбы, у адказ на шкодніцтва Разанцавых заяўляем:

Наш калгас мае 421 га пахаці і 150 га сенажаці. Выключна сваімі сіламі мы засеялі 180 га яравых і ўбралі 120 га жыта, з уборкай ураджаю і асеньняй сяўбой мы справіліся.

Цяпер мы ставім сваёй задачай разьвіцьцё сьвінагадоўлі. Мы будуем два сьвінарнікі на 250 сьвінней, і ўжо маем 120 сьвіней, да канца пяцігодкі ў нас іх будзе 3 тысячы.

Мы прымем усе меры да паляпшэньня забесьпячэньня пралетарскіх цэнтраў мясам і гародніной, абвяшчаем сябе ўдарнікамі па выкананьні гэтай задачы.

Нашы калгасьнікі ня рэзалі для сябе цялят і, такім чынам, з'эканомілі 32 цялят, якія пойдуць для забесьпячэньня гораду.

У гэтым годзе мы здалі дзяржаве 35 пудоў мёду. Мы пасадзілі сад у 50.000 дрэў, зараз дадаткова адводзім пад сад яшчэ 20 га.

Мы ўжываем усе меры, каб дапамагчы беднаце. Сёлета беднята вёсак Шмакі, Чырвоны Барок была абслугована намі як у малацьбе, так і ў ворыве.

Уадказ на шкодніцтва контр-рэвалюцыянэраў разанцавых у наш калгас уступіла 5 гаспадароў адзінаасобнікаў. З кожным днём да нас прыбываюць новыя адзінаасобнікі.

Старшыня калгасу «Праца» Мулёў, сакратар Тахновіч, члены калгасу: Лук'янаў, Кавалёў, Савіцкі.

1.500 ЛІТРАЎ МАЛАКА ШТОДЗЕННА—

дае прыгарадная фэрма барысаўскім пралетарам

За 3 вярсты ад Барысаўа, у былым маёнтку Мікалая Мікалаевіча, зараз знаходзіцца прыгарадная гаспадарка Барысаўскага ЦРК. У спадчыну ад сельска-гаспадарчага тэхнікуму, ЦРК атрымала 80 змораных кароў, 18 коняй, напалову зруйнаваны інвэнтар і некалькі маленькіх пабудаў.

Але дзякуючы намаганьням кіраўнікоў гаспадаркі, загадчыка і агранома, справа адразу рэзка зрушылася ўперад. Зараз фэрма ўжо мае чым пахваліцца. На былых пустырох вырасьлі ўзорныя сьвінарнікі і кароўнікі. Адрамантаваны кватэры для рабочых. Распачата будаўніцтва некалькіх дамоў на 40 кватэр. На будаўніцтва ўжо затрачана каля 80.000 руб.

350 добрых кароў стаяць у сьветлых кароўніках. 1.500 літраў малака штодзённа адпраўляе фэрма ў горад. Будуецца яшчэ адзін кароўнік на 400 галоў.

У гаспадарцы раней ня было ні адной сьвіньні, зараз ужо ёсьць кала 600, у тым ліку 230 сьвінаматак, звыш 300 ладых парасят, выгадаваных на фэрму. Цяжка было будаваць сьвінную гаспадарку.

76 добрых коняй — тужавы транспорт фэрмы. Два трактары заўсёды працуюць у дзьве зьмены.

Ураджай агародніны на фэрме ў гэтым годзе нябывалы. Адной раны капусты сабрана 150 тон, позьняй — каля 400 тон і 750 тон сульбы. Ужо солена 250 бочак гуркоў.

Пяспрыяючае лета патрабавала ў часе ўборк максымуму энэргіі ад работнікаў фэрмы. Толькі дзякуючы сапраўднай ударнай рабоце і сацыялістычнаму спаборніцтву, якое разгарнулася па агародах, уборка была скончана своячасова. Зараз канчаецца малацьба, звыш 60 % першагатункованага жыта падрыхтавана для абмену суседнім калгасам, 4 брыгады працуюць сапраўды паўдарнаму. Зьяўляюцца прыкладам для ўсіх работ фэрмы. Не адстае фэрма і з сіласаваньнем — 360 тон зялёнае масы ўжо засіласавана.

У гаспадарцы не хапае цягавай сілы.

— Мала дапамогі, — скарджацца загадчык фэрмы т. Пушкінскі—Белкаапсаюз абяцаў даць 2 грузавікі, але абяцаньне так і засталося нявыкананым.

Фэрма мае вялікія перспэктывы. Пры далейшым належным кіраўніцтве яна апраўдае ўскладзеныя на яе надзеі.

У такой загадчыка ажыўленьне. Рэпрацоўваецца плян, паводле якога пачнецца на далей разьвіваецца гаспадарка. Пры вільей кажучы, уносяцца карэктывы ў першапачатковы плян — павялічэньне зямельнае плошчы патрабуе павялічэньня жывёлы. Патрэбны грузавікі, трактары і людзі. Гэту дапамогу трэба фэрме аказаць за што-б там ні стала.

Я. ФАЛЬКО.

Барысаў, верасень.

Апарат сувязі—тварам да раёну

Скончыўся першы Усебеларускі зьезд вагалічкаў раённых аддзелаў сувязі, прысьвечаны паленшаньню ўсіх відаў сувязі, у зьвязку з ліквідацыяй округ.

Зьезд адзначыў, што работа пошты, радыё і тэлеграфу ў БССР не адпавядае тым вялікім запатрабаваньням, якія прад'яўляюць апарату сувязі шпаркія тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва, разьвіцьцё калгаснага руху, рост добрабыту мас.

Паштовая сетка ахапляе толькі 75% насельніцтва. Надзвычай слабая сетка радыё, аусім незадавальняючая работа на радыёфікацыі. Сталая радыёсувязь наладжана толькі па 17 раёнах, у іншых жа раёнах толькі зараз устанаўляюцца радыёпрыёмнікі. Менск дрэнна зьвязаны з раёнамі. Апарат сувязі працуе дрэнна: газэты дастаўляюцца псакуратна, менская тэлефонная сетка працуе слаба, ёсьць перабоі ў перадачы і дастаўцы тэлеграм, незадавальняючая перадача па міжнародным тэлефоне.

Зьезд пастанавіў узяць самыя рашучыя меры для палепшэньня сувязі з раёнамі. Абмен пошты ў сельскіх мясцовасьцях трэба давесьці да 4-х раз у 5 дзён. Трэба паступова мэханізаваць перавозку і дастаўку пошты ў гарадох і сельскіх мясцовасьцях.

Зьезд пастанавіў перавесьці ўсе гарадзкія і раённыя тэлеграфна-тэлефонныя прадпрыемствы на работу на працягу поўных сутак, іншыя прадпрыемствы на 14-гадзінную работу; скарыстаць усе запасныя правады для электрычнай сувязі. Зьезд адзначыў неабходнасьць поўнага выкананьня пляну радыёфікацыі БССР у 1931 годзе, зьвярнуўшы асаблівую увагу на ўкараненьне радыё ў гушчу працоўных.

Зьезд абавязаў беларускае кіраўніцтва сувязі поўнасьцю выканаць пастанову СНК БССР аб правядзеньні раду работ па капітальным будаўніцтве, па арганізацыі тэлефонных аўтаматычных станцый у Менску, Гомелі, Віцебску, Бабруйску, Магілеве, Воршы, па пабудове кабельных падземных ліній і радыёстанцыі ў Менску. Трэба поўнасьцю тэлефанізаваць сельсаветы ў 17 раёнах былых Полацкай, Менскай, Бабруйскай і Мазырскай округ.

Зьезд абавязаў былыя канторы акруговых цэнтраў зараз-жа перадаць у раёны да 50 проц. апаратуры, розныя тэлеграфна-тэлефонны матар'ялы і дрот, а таксама рад работнікаў для ўзмацненьня сувязі ў раённых цэнтрах.

Зьезд запрапанаваў Беларускаму кіраўніцтву сувязі дабіцца ў самы хутчэйшы час непасрэднай простай сувязі па тэлеграфе і тэлефоне Менску з раёнамі.

Улічваючы непрыстасаванасьць памяшканьняў аддзелаў сувязі ў раёнах, зьезд паставіў перад Наркампаштолем пытаньне аб павялічэньні ў 1931 г. водпуску крэдытаў на пабудову новых будынкаў у раёнах, каб у 1931 годзе кожны раённы аддзел сувязі меў-бы свой уласны будынак з патрэбным абсталяваньнем і тэхнічнай устаноўкай.

Зьезд ухваліў катэгарычную пастанову аб тым, каб у самым тэрміновым парадку дабіцца рашучага пералому ў рабоце пошты, шляхам узьмацьненьня працоўнай дысцыпліны, барацьбы з расхітваньнасьцю, разгортваньня сацспаборніцтва і ўдарніцтва, плянаменнага і наўкхільнага арабачэньня апарату сувязі.

А. Дубіна.

У калегіі Наркамзему

— Калегія НКЗ пастанавіла перадаць саўгас «Дружа» трэсту «Ветснабпром» для арганізацыі **лябараторыі па выпрацоўцы біялягічных прэпаратаў** для барацьбы з заразьнымі хваробамі жывёлы.

Лябараторыя забясьпечыць сельскую гаспадарку БССР рознымі біа-прэпаратамі, у асаблівасьці прэпаратамі супроць чумы сьвіней.

* * *

Калегія НКЗ, паводле прапановы ЦК ЛКСМБ, пастанавіла арганізаваць у Менску **цэнтральную с-гаспадарчую дзіцячую станцыю.**

— Калегія НКЗ зацьвердзіла пастанову Пухавіцкага РВК аб арганізацыі новага саўгасу «Рэпішча» на плошчы 590 га. Саўгас перададзены Сьвінаводтрэсту

* * *

— Калегія НКЗ запрапанавала сэктару зямляўпарадкаваньня і меліярацыі зараз-жа арганізаваць **гідракультурэтхнічныя досьледы** на балотным масыве ў 5000 га ў басейне ракі Сьвядзіца (Лепельскі раён). На гэтым месцы будзе арганізаваны саўгас плошчаю ў 8000 га.

* * *

— Калегія НКЗ пастанавіла **заканцрактаваць** у бягучым годзе па БССР у абагуленым і індывідуальным сэктарах сельскае гаспадаркі **1.500 штук племяннога маладнякa-трусоў.** Кантрактацыя павінны быць скончана да 1-га лістапада.

(Сяпібская ячэйка, Сьвісьлецкага раёну)

МЕНСК

МЕНГАРСАВЕТ УХВАЛІЎ ПРАПАНОВУ

аб скарыстаньні трамвайнай лініі для перавозкі грузаў

Пытаньне аб прыстасаваньні трамвайнай лініі для перавозкі грузоў, вынесенае «Зьвяздой», гэтымі днямі абмяркоўвалася ў гарсавеце.

Прэзыдыум гарсавету згадзіўся з прапановай начальніка Беларазьлення Саюзтрансу т. Кейліна аб скарыстаньні трамвайнай лініі для перавозкі грузаў. Гарсавет пастанавіў працягнуць трамвайную ветку да складаў таварнай станцыі.

Транспартрэсту запрапанаван распрацаваць пытаньне аб пабудове веткі ад галоўных трамвайных ліній да заводу «Дрэваапрацоўшык» і «Беларусь».

На першы час трамвайны шлях будзе скарыстаны для перавозкі грузаў на пляцоўках аўтамабільнай і конпай цягай.

Даручана Транспрэсту дагаварыцца з Саюзтрансам аб парадку эксплёатацыі трамвайных ліній для перавозкі грузаў.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

СЁНЬНЯ, 4 КАСТРЫЧНІКА

— **Дом камасьветы.** А 8 г. увеч. абдудзецца даклад тав. Рыўліна для парт. і камс. актыву на тэму «Фашызм і сацыял-фашызм». Пасьля мастацкая частка. Білеты ў чытальні дому і РК.

— А 6 гадз. увеч. у памяшк. **ЦП саюзу працасьветы** абдудзецца пасяджэньне пастаўсьветнага сэктару ЦП. Лука дабраахвотнікаў сэктару, а таксама кіраўнікоў і членаў палітасьветных груп ГК, НК—абавязкова. Запраш. асьветнікі, жадаючыя прыняць удзел у працы палітасьветсэктару.

— **БДУ.** А 6 гадз. увеч. у гал. корп. (4-ты паверх) абдудзецца агульны сход партыйцаў і камсамольцаў падфаку першых курсаў. Лука абавязкова.

— **БДУ.** А 5 г. увеч. у гал. корп., 210 аўд. абдудзецца сход асьпірантаў БДУ і Мэдінстытуту. Яўка абавязкова. Запрашаюцца кіраўнікі асьпірантаў.

ЗАЎТРА, 5 КАСТРЫЧНІКА

— А 10 гадз. ран. Агіт-масавы аддзел ЦК КП(б)Б склікае інструкцыйную нараду т. т., мабілізаваных ЦК КП(б)Б для правядзеньня кампаніі перавыбараў делегацыяў сходаў на вёсцы. На нараду павінны ў абавязковым парадку зьявіцца наступныя таварышы: **Масловз**—(ЦСПР), **Ратнэр, Чернабародава**—(ЦСПСВ), **Юшкевіч** (Быткамісія ЦВК), **Адамчук** (БКС), **Юдкес** (саюз прац. маст.), **Кірнес** (Калгасцэнтр), **Шустэр** (НК працы), **Вішнеўская** (ВСНГ), **Каменецкая** (Гар. дашк. інсп.), **Лебедзеева** (НКА), **Гольдвасэр** (БЖС), **Гурэвіч** (НКАЗ), **Тэтэвіч** (Ахова мацярынства і младзенства), **Пятроўская** (НКГандаль), **Барабёва** (Асаавіяхім), **Сташэўская** (ЦК МОПР'у), **Эфраімская** (БКС), **Левіна** (Дом Камасьветы), **Калабеева** (Нарсувязь).

Нарада адбудзецца ў памяшканьні ЦК КП(б)Б (другі паверх, пакой № 26).

— **Дом пісьменьніка.** а 7 гадз. увеч. адбудзецца заняткі літаратурнай цэнтральнай рабочай студыі БелАПП'у. Прысутнасьць членаў студыі абавязкова. Запрош. усе жадаючыя.

— **ЦБ сэкцыі навуковых працаўнікоў** паведамляе, што 5-та кастрычніка адбудзецца агульна - гарадзкі сход навуковых працаўнікоў. Парадак дня: 1. Вынікі курортнай кампаніі, 2. Справаздача і перавыбары праўленьня клюбу. Сход адбудзецца а 7-й гадз. увеч. у клюбе навуковых працаўнікоў. Прысутнасьць усіх членаў сэкцыі, якія набывалі на курортах і дамох адпачынку, абавязкова. Запрашаюцца ўсе члены сэкцыі.

— А 8 гадз. увеч., у первовай клініцы адбудзецца пасяджэньне фізыя-тэрапэўтычнай сэкцыі. Парадак дня: 1. Арганізацыя і плян працы Інстытуту фізыятэр., ортапед. і нэўралёгіі. Дакл. Кац, праф. Кроль, дацэнты Маркаў і Шапіра. 2. Агляд інстытуту. Запрашаюцца ўсе дактары.

— **Аддзел разьмеркаваньня ЦК КП(б)Б** просіць зьявіцца у ЦК (пакой № 1) т. Прус (былога інструктара Менаддзялення БКС) па цікавячай яго справе.

— Фрунзаўскі РК КП(б)Б паведамляе, што сёньня, 4 кастрычніка, а 7-й гадз. увечары, у памяшканьні Дому Камасьветы адбудзецца парада ўсіх прапагандыстых партыйнай сеткі РК, па пытаньні аб пачатку вучобы і кансультацыі па II-й тэме.

На нараду павінны зьявіцца наступныя таварышы: Лебедзеў (Камвуз), Шамэс С. А. (Камвуз), Гудоў П. В. (Камвуз), Герасёў А. Б. (Камвуз), Войценкаў М. Б. (Камвуз), Худзенко А. В. (Камвуз), Куліненка Т. Я. (Камвуз). Бароўскі З. А. (Камвуз), Кучаравы В. З. (Камвуз), Лебедзь А. Н. (Камвуз), Кануцкі А. Р. (Камвуз), Лук'яненка П. П. (Камвуз), Клімаў І. С. (Камвуз), Каржыцкая Н. І. (Камвуз), Лук'яновіч У. П. (Камвуз), Міновіч А. Ц. (Камвуз), Науталіна С. І. (Камвуз), Прусьлін Я. В. (Камвуз), Салаўёў Р. М (Камвуз), Салдаценка А. У. (Камвуз), Столін Х. Л. (Камвуз), Сьнефановіч П. В. (Камвуз), Тоўсьцік У. В. (Камвуз), Фрадкін Я. І. (Кам.), Берын І. Я. (Камвуз), Гарбуноў Ц. С. (Камвуз), Капэльсон Л. В. (Камвуз), Ліпкін Р. А. (Камвуз), Левіт Л. Н. (Камвуз), Льовіч Д. А. (Камвуз), Тяхаў Т. А. (Камвуз), Лебэдзеў С. М. (Камвуз), Мацюкоў П. В. (Камвуз), Пугачоў С. Х. (Камвуз), Пракаповіч Л. С. (Камвуз), Шмідт (Бел. Вёска), Спэктар (СНК), Вержбаловіч (Зьвязда), Папоў (Зьвязда), Трубовіч (Будаўнікі), Эфраімская (Будаўнікі), Мяцеліца (Прыгарадны с/с.), Угараў (Лесбел), Рак (Эльвод), Каўноў (БАН), Дунец (СНК), Сухараў («Рабочий»), Фанбэр (СНК), Фрыдман (СНК), Віткін (БДВ), Капнер (з. «Беларусь»), Вайнбэрг («Камунарка»), Гаўзман (з. «Пралетары»), Літвіновіч (НКГандлю), Сандлер (Белдзяржстрах), Фрыдман (Праф. Асьветы), Лазарэнка (НКАсьветы), Заромскі (НКАсьветы), Сіпінкі (НКАсьветы), Радзераў (Белдзяржстрах), Ажгерэй (Падфак), Кульбакоў (зав. «Камунар»), Шыф (зав. «Камунар»), Герасімчык (зав. «Камунар»), Зоненшайн (зав. «Камунар»), Гершанович (зав. «Камунар»), Раўніцкі (зав. «Камунар»).

Яўка ў парадку партыйнай дысцыпліны абавязкова.

Незьявіўшыяся таварышы будуць пераданы па Бюро РК.

Фрунзаўскі РК КП(б)Б паведамляе, што заняткі ў першапачатковай раённай партыйнай школе пачынаюцца 8 кастрычніка, а 7-й гадз. увеч., у памяшк. 4-й 7-годкі (Савецкая, 95, супроць сквера). Усе т. т., якія прайшлі праверку, а таксама тыя, якія яшчэ праверку не прайшлі, павінны зьявіцца своячасова. Незьявіўшыяся ў школу прызнаюцца ня будуць.

Час. вык. абав. адказ. рэдактара **А. МІТЛІН.**

Сёньня, 4 кастрычніка, у памяшканьні Камвузу адбудзецца пасяджэньне

Таварыства гісторыкаў-марксыстых

З АБВЕСТКАЙ ДНЯ:
«Аб становішчы на гістарычным фронце вашых задач»—тав. **Сарбэта.**
Пачатак а 8 гадз. увечары.

Праўленьне Таварыства.

Кастрычніцкі РК КП(б)Б паведамляе, што прызначаны пашыраны р[illegible] **ны актыў** на 2-X—г. г. **АДБУДЗЕЦЦА СЁНЬНЯ,** а 7 г. увечары, у клюбе м[illegible] лістых (Універсытэцкая, 12).

ПАРАДАК ДНЯ:

1. Забесьпячэньне рабочых і задачы рабочага кантролю (закрытыя р[illegible] меркавальнікі, авансы пад дэфіцытныя тавары і г. д.).
2. Вынікі распасюджаньня пазыкі «Пяцігодка — за чатыры гады» [illegible] раёне.

На актыў у абавязковым парадку павінны зьявіцца ўсе члены бю[illegible] парткалектываў, парт'ячэек і ячэек ЛКСМБ, члены фракцыі ФЗМК, кіраўні[illegible] прадпрыемстваў і ўстаноў — партыйцы і камсамольцы.

Уваход па білетах, якія атрымаць ячэйкам у РК, пачынаючы з 1-га к[illegible] стрычніка.

УСІМ АРГАНІЗАЦЫЯМ ЛКСМБ

ЦК ЛКСМБ паведамляе, што 7-га кастрычніка г. г. склікаецца **ЧАРГОВЫ ПЛЕНУМ ЦК ЛКСМБ** з наступным парадкам дня:

1. Ліквідацыя округ і чарговыя задачы райарганізацый.
2. Аб скліканьні 10-га зьезду ЛКСМБ і правядзеньні райканфэрэнцый.
3. Арганізацыйныя пытаньні.

На пленум ЦК выклікаюцца члены і кандыдаты Цэнтральнага Камітэту і Цэнтр. Рэвізійн. камісіі і ўсе сакратары ГРК і РК. Пленум адкрываецца а 6-й гадз. у залі пасяджэньняў ЦК КП(б)Б.

Сакратар ЦК ЛКСМБ ПАЛЯКОЎ.

ПУШКІНСКАЯ БІБЛІЯТЭКА. З 1-га кастрычніка да 1-га лістапада г. г. праводзіцца **ПЕРАРЭГІСТРАЦЫЯ ЧЫТАЧОЎ ПУШКІНСКАЙ БІБЛІЯТЭКІ** і яе філіялаў. Чытачы, якія не перарэгіструюцца ў працягу гэтага тэрміну, будуць лічыцца выбылымі і пакінутыя залогі пойдуць у карысьць бібліятэкі, а затрыманыя імі кнігі будуць спатканы праз народны суд. Пры перарэгістрацыі патрэбна прад'явіць дакумант з паказаньнем хатняга адрасу. Платнасьць у бібліятэках палітасьветы скасавана.

Бюро сакцыі працаўнікоў друку у суботу 4 кастрычніка, а 7 г. увеч., у памяшк. ЦП саюзу друкароў (Дом Працы, пакой № 19), склікае **НАРАДУ КІРАЎНІКОЎ ВЫДАВЕЦТВАЎ: БДВ, «ЗЬВЯЗДА», «РАБОЧИЙ», САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ», «БЕЛ. ВЁСКА», «АКЦЯБР», «ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА»** і распасюджвацельскіх арганізацый: Белкаапсавузу, Цэнтрвыдавецтва, Выдавецтва РСФСР, пошты і саюздруку па пытаньні: **«Падрыхтоўка рэдакцыйна-выдавецкіх і распасюджвацельскіх кадраў».**

На нарадзе таксама павінны прысутнічаць прадстаўнікі ЦП саюзу друкароў, ЦП саюзу саўгандальслужачых і камітэту па справах друку.

Прадстаўнікі павінны прынесьці з сабой папярэднія матар'ялы аб падрыхтоўцы кадраў.

Адказнасьць за яўку ўскладаецца на кожную арганізацыю персанальна.

ПАСТАНОВА

Камітэту па дырыжаблябудаўніцтве пры Цэнтральным Савеце Асоавіяхіму БССР

Адзначыць, што кампанія па зборы сродкаў у фонд дырыжаблябудаўніцтва яшчэ не дае выстарчальнага эфэкту, і іншымі арганізацыямі слаба разгорнута.

На аснове пастаноў Прэзыдыуму ЦС ОАХ БССР Камітэт па зборы сродкаў у фонд дырыжаблябудаўніцтва **пастанаўляе:**

1. Прапанаваць усім раённым і гарадзкім камітэтам і ячэйкавым камісіям зараз-жа разгарнуць кампанію па зборы сродкаў, шляхам скарыстаньня ўсіх мясцовых магчымасьцяй і крыніц, для чаго:

а) распрацаваць плян скарыстаньня ўсіх клюбаў, парламоў, хат-чытальняў і г. д. з пастаноўкай дакладаў аб будаўніцтве савецкіх дырыжаблёў і адкрыцьці збору сродкаў на апошнія;

б) арганізоўваць спэктаклі, кінасеансы з мэтай збору сродкаў у карысьць фонду;

в) наладжваць персанальныя выклікі і акуратна зьбіраць па іх сродкі;

г) вылучаць спэцыяльныя брыгады, як для арганізацыі, так і збору сродкаў і даны іх у паказаны прэзыдыумам ЦС термін на бягучы рахунак Усебеларускага фонду дырыжаблябудаўніцтва.

2. Прапанаваць усім райсаветам і іншым вясковым ячэйкам вылучыць спэцыяльныя брыгады для арганізацыі кампаніі па зборы сродкаў сярод сялянства, калгасных і саўгасных ячэек, захоўваючы поўнасьцю выключна добраахвотнасьць і ініцыятыву працоўных мас сялянства.

3. Прасіць ЦК ЛКСМБ зьвярнуцца з адозвай да ўсёй моладзі—дапамагчы арганізацыям Асавіяхіму правесьці кампанію па стварэньні фонду дырыжаблябудаўніцтва і актыўна ўдзельнічаць ва ўсёй работе па зборы сродкаў.

4. Зьвярнуцца з заклікам да культэфа Чырвонай арміі саюзу работнікаў мастацтва і асьветы аб накіраваньні апошнімі сіл на дапамогу па правядзеньні кампаніі.

5. Зьвярнуцца з заклікам па ўсіх ВНУ і ВТНУ БССР аб мабілізацыі сіл і думкі студэнтаў і настаўніцтва вакол кампаніі збору сродкаў на савецкае буйное дырыжаблябудаўніцтва.

6. Прасіць адпаведныя органы дазволіць ЦС Асоавіяхіму арганізаваць выпуск спэцыяльных марак з адлічэньнем сабраных сродкаў у фонд дырыжаблябудаўніцтва.

7. Лічыць неабходным правядзеньне Усебеларускага дня дырыжаблябудаўніцтва, для чаго весьці падрыхтоўчую работу і зьвязацца з Камітэтам СССР па гэтым пытаньні.

8. Зьвярнуцца праз газэты да ўсіх арганізацый аб згуртаваньні ўсіх сабраных сродкаў у адзіны Усебеларускі фонд дырыжаблябудаўніцтва, на бягучы рахунак № 1016 у Дзяржбанку ў г. Менску.

9. Прасіць Усесаюзны Камітэт і ЦС саюзу ОАХ аб дасылцы ў ЦС ОАХ БССР рукапісаў, брашур па дырыжаблябудаўніцтве для выданьня на нацмовах у БССР.

10. Прапанаваць усім гарадзкім і раённым арганізацыям ОАХ зьвярнуцца да вайсковых ячэек ОАХ аб вылучаньні апошнімі сіл дзеля дапамогі ў правядзеньні работы па растлумачэньні мэт дырыжаблябудаўніцтва і збору сродкаў на апошнае.

11. Прасіць сэктар друку ЦК даць паказаньні ўсім газэтам—шырэй разгарнуць прапагандысцкую работу аб дырыжаблябудаўніцтве на старонках газэт.

Старшыня камітэту па дырыжаблябудаўніцтве пры ЦС Асоавіяхіму БССР ДРЫЛЕНАК.

Хроніка МОПР'у

НОВЫ СКЛАД ПРЭЗЫДЫУМУ ЦК МОПР'у БССР

У сувязі з ад'ездам некаторых членаў прэзыдыуму ЦК МОПР'у БССР пераабраны новы склад прэзыдыуму. Старшыня ЦК МОПР'у Бел. абраны т. **Клыс,** намесьнікам старшыні т. **Цудзін** і адказным сакратаром—т. **Сьцяпаноў** (рабочы мэталісты, загадчык арганізэдзелу ленінградскага абкому МОПР'у).

УДАРНЫ ДВУХМЕСЯЧНІК ПЕРАВЫБАРЧАЙ КАМПАНІІ

ЦК МОПР'у БССР пастанавіў на працягу кастрычніка-лістапада месяцаў ударным парадкам правесьці **перавыбары нізавых арганізацый МОПР'у.** Паводле выпрацаванага пляну, з 1 па 15 кастрычніка адбудуцца перавыбары бюро ячэек МОПР'у у гарадох, з 15 кастрычніка па 1 лістапада перавыбары бюро вясковых ячэек, з 1 па 15 лістапада будуць праведзены раённыя канфэрэнцыі МОПР'у. **На 25-га лістапада пастаноўлена склікаць усебеларускі зьезд МОПР'у.**

Паводле ўстаноўленага модусу ад раёнаў БССР на Усебеларускі зьезд прыбудуць 200 делегатаў.

УДЗЕЛ МОПР'у У БУЛЬБАЗАГАТОЎКАХ

Пры ЦК МОПР'у арганізаваны штаб кіраўніцтва па ўдзеле мопраўцаў у бульбазагатоўках. **Хатнія гаспадыні—члены МОПР'у 9-ці жактаўскіх ячэек мабілізавалі сябе цалкам на работу па бульбазагатоўках на 2-3 дні ў бліжэйшыя калгасы і саўгасы** і выклікаюць ўсё іншыя жактаўскія ячэйкі МОПР'у гор. Менску. **Учора 50 чал. ужо прыступілі да працы.**

ГРУПАВЫЯ НАРАДЫ АКТЫЎУ МОПР'у.

Фрунзаўскі і Кастрычніцкі райкомы МОПР'у праводзяць групавыя нарады актыву ячэек МОПР'у ў наступным парадку: 4 кастрычніка—**школьныя і вузаўскія;** 5 кастрычніка—**жактаўскія і саматужнікаў;** 6 кастрычніка—**савецкія,** 7-кастрычніка—**вайсковыя** і 8 кастрычніка—**фабрычна-заводзкія** па пытаньні справаздачна-перавыбарчай кампаніі і аб бліжэйшых задачах МОПР'у.

ФРУНЗАЎСКІ І КАСТРЫЧНІЦКІ РК МОПР'у

склікаюць

АГУЛЬНА-ГАРАДЗКІЯ ГРУПАВЫЯ НАРАДЫ АКТЫВУ ЯЧЭЕК МОПР'у

У НАСТУПНЫМ ПАРАДКУ:

СУБОТА 4-га КАСТРЫЧНІКА	ШКОЛЬНЫЯ І ВУЗАЎСКІЯ ЯЧЭЙКІ
НЯДЗЕЛЯ, 5-га КАСТРЫЧНІКА	ЖАКТАЎСКІЯ І САМАТУЖНЫЯ ячэйкі
ПАНЯДЗЕЛАК, 6-га КАСТРЫЧНІКА	САВЕЦКІЯ ЯЧЭЙКІ.
АУТОРАК, 7-га КАСТРЫЧНІКА	ВАЙСКОВЫЯ ЯЧЭЙКІ.
СЕРАДА, 8-га КАСТРЫЧНІКА	ФАБРЫЧНА-ЗАВОДЗКІЯ ЯЧЭЙКІ.

Нарады адбудуцца ў памяшк. ЦК МОПР'у
Пачатак роўна а 7 годз. увечары.
Яўка для ўсіх членаў Бюро ячэек і Рэв. кам.- абавязкова.

ЦП саюзу Саўгандальслужачых

паведамляе, што

пранят мінскай агульна-гарадзкой канфэрэнцыі членаў саюзу СГС па пытаньні аб рабочым забесьпячэньні і рабоце МЦРК

адбудзецца 4-га кастрычніка, а 7 г. увеч., у памяшк. клюбу саўгандальслужачых. Яўка ўсіх дэлегатаў, старшынь МК і ўдарніцаў абавязкова. Запрашаюцца ўсе прафактыў і члены саюзу. Усклаваецца на адказнасьць старшынь МК і ГК шырока інфармаваць саюзную масу аб пранятым канфэрэнцыі і забясьпечыць своячасовую яўку. Пасьля канфэрэнцыі будзе дана мастацкая пастаноўка тэатру малых форм клюбу СГС.

Масцкі ЦЫРК | Пад кіраўніцтвам І. Л. СТРАШЭВІЧА

Субота, 4, нядзеля, 5, панядзелак, 6 кастрычніка

МАСТАЦКА-ПАКАЗАЛЬНЫЯ ЗРЭЛІШЧЫ

Гастрэлі юмарных паверагулых гімнастаў **2 пішчанскіх**

Універсальных артыстых **5 ОРАВЫХ** Бытавыя музычныя твары пішчыкі

Лепшы ілюзіяніст **Э. РАНЦОЦІ.** | Музычныя клоўны **РЫМ-РОМ.**

Рэдкі мастак **4 ЦАППА** | Мастэрскіяя галубоў і коні **НІСО**

І шмат іншых нумароў.

— Пачатак а 8 з пал. г. увеч. —

Адказны кіраўнік І. Л. СТРАШЭВІЧ.

Анонс: Гэтымі днямі сусьветная сэнсацыя **ОРКАЛЬДО.**

Кіно-тэатр „Культура"

Новы выключна-мастацкі бавік вытворчасьці „Сакэніно"

Песьня пра першую дзяўчыну

І выш праграмы:

ПАРТЫЯ КЛІЧА ў 2-х частках.

Спэцыяльны выпуск да „Дня Ўдарніка".

Пачатак сэансу: а 7 г., 8 г. 40 м., 10 г. 20 м.

Каса адчынена ад 5 гадз.

КІНО „Інтэрнацыянал"

Новы замежны фільм

„АБШАРПАНЫЯ ВЕТРАЗІ"

кіно-раман у 8 частках.

Штодзенна 3 сэансы. Пачатак 1-га а 7 г.

Каса адчынена з 5 гадзін.

КІНО „Пралетары"

Толькі 3 дні 3, 4 і 5 кастрычніка

Мастацкі фільм Рэжысэр Г. КРОЛЬ

СЬМЯРОТНЫ НУМАР

Драма на арэне цырку ў 6 частках.

Пачатак 1-га сэансу а 6 г., 2-га—7 г. 30 м., 3-га—9 гад., 4-га—10 г. 30 м.

Каса—ад 4 гадз.

Дзіцячы кіно-тэатр „Юны піянэр"

Новы замежны фільм

НЯМЫ ПРЫЯЦЕЛЬ

кіно-фільм у 6 частках.

ШТОДЗЕННА 2 СЭАНСЫ.

Пачатак 1-га сэансу а 2 г. дня.
„ 2-га „ а 3 „ 30 м.

Каса адчынена з 12 гадз. дня.

Цана білета—20 к., для дзяцей да 12 год—10 к.

Кіно „Спартак"

Падвойная праграма

ДВА ГІГАНТЫ ў 5 частках

Замежная камедыя **ЛУІ Ў РАІ** ў 3 частках.

Пачатак сэансаў: 1-га а 7 г., 2-га—9 г., 3-га—10 г. 45 м.

Каса—ад 6 гадз.

НАРОДНЫ КАМІСАРЫЯТ АХОВЫ ЗДАРОЎЯ БССР

АБВЯШЧАЕ КОНКУРС

на 2-х ардынатараў пры доме грудного дзіцяці

для вядзеньня навукова-пэдагагічнай работы пры арганізуючымся на базе аду ўстаноў аховы мацярынства і младзенства г. Менску інстытуце аховы мацярынства і младзенства

Заявы з аўтабіяграфіяй з дадаткам сьпісу, у каго ён ёсьць, навуковых прац накіроўваць у НКАЗ БССР.

Конкурс абвешчаны да 10-X—1930 г.

Народны камісар аховы здароўя БССР ЦЭНЦЫПЭР.

Школа Малодшага Тэхнічнага Пэрсаналу

ДЫРЭКЦЫІ ЗАХ. ЧЫГ.

з 2-х гадовым тэрмінам навучаньня

АБВЯШЧАЕ ДАДАТКОВЫ НАБОР

на наступныя аддзяленьні:

1) Эксплёатацыйнае 50 (па падрыхтоўцы пам. нач. станцый).
2) Цягавае—50 чал. (па падрыхтоўцы пам. машыністаў).

Прымаюцца асобы, скончыўшыя 7-годкі і адпавядаючыя ёй школы, не старэй 22 гадоў.

Заявы без дакумантаў не разглядаюцца. (Правілы прыёму—што і ў тэхнікумы). Прынятыя забясьпечваюцца інтэрнатам.

Прыём заяў да 10-X г. г., заняткі 15-X—30 г.

АДРАС: **от. Калінавічы зах. чыг., школа МТП**

Начальнік школы **Ласевіч.**

ПРЫЁМ ЗАЯЎ

У ЧАЧЭРСКУЮ СЬВІНАГАДОЎЧУЮ ПРАФШКОЛУ

(з 1-га студзеня будзе тэхнікум) па групе рабочых, батракоў а таксама сялян-беднякоў і калгаснікаў працягнут

ДА 1-га КАСТРЫЧНІКА.

Да заявы патрэбна далучыць: пасьведчаньне аб скончаньні 7-годкі, анкету і ўсе неабходныя дакументы, згодна даведніка НК асьветы.

Частка студэнтаў забясьпечваецца стыпэндыяй і інтэрнатам.

Тэрмін навучаньня—2 з палов. гады.

АДРАС: **Чачэрск, Прафтэхшкола.**

Вышаў з друку, разасланы ўсім падпісчыкам і паступіў у раздробны продаж

№ 26 (ВЕРАСЕНЬ) ЧАСОПІС

„БЕЛАРУСКАЯ РАБОТНІЦА І СЯЛЯНКА"

ЗЬМЕСТ НУМАРУ:

1. Усе сілы на ліквідацыю прарыву другога году пяцігодкі (Аб чым гаварылі ў адсьвяце ЦК УсеКП(б).
2. Г. Самусеьіч.—«Рыхтуемся да сустрэчы новых калгасьнікоў».
3. Зорка.—«Вазьмешаўскімі тэмпамі».
4. Брыгадзірка Путырская.—«Больш увагі кваліфікацыі работніц».
5. Г—а.—«Чырвоныя гасьцінні» (паэма).
6. З апавесьці Бярозаўскага.—«Маці» (пераклад).
7. Масовы матар'ял.—
   а) Калгаснік.—Тысячу пудоў дзяржаце.
   б) Сялькор.—Здаем хлеб дзяржаве.
   в) Падпісаліся—выклікаем.
   г) Алесь Лубін.—Сельсавет бязьдзейнічае.
   д) Новікава.—Дэлегатка-аўтасьніца падпісаліся на месячны аклад.
   е) Брыгадзірка Турыва. — Атгукнуліся на адозву ЦК УсеКП(б).
   ж) Брыгадзірка Мядзьведзева.—Адозва ўскалыхнула ўсіх рабочых.
   з) Наумэнка М. А. — Бытавыя ўстановы асабаваюць жаночыя рукі для паляных работ.
   і) Г. М.—Трэба дзяцей адных не пакідаць.
   к) Бярозка.—Жаночыя брыгады па ўборцы.
   л) Ганна.—Дапамога калгасам.
   м) А. Лубін.—Бядняцка Лагун прышла ў калгас.
   н) М. Дарожка.—Па-ўдар яму правялі ўборку.
   о) Цытовіч Н.—Ня згнае наша ярыца.
   п) Сялькор.—Арганізавана ўбралі з поля.
   р) Затоўка.—Сковыя своячасова.
   с) Сялькорка Гантман.—Пачалося новае жыцьцё.
   т) Дэлегатка.—Пасьлабла прана
   у) Т. Панова.—Быстрыць сталага кіраўніка.
   ф) Чапка.—Няма праны в далега камі.
   х) Галянчук М.—Забылі пра далегатак.
   ц) А. Лубін.—Ячэйка ТСА авіяхіму бязьдзейнічае.
   ч) А. Лубін.—Парушае працысцыпліну.
   ш) С.—Спекуляцыя хлебам.
8. Др Поляк.—Вакорычныя хваробы ў жанчын (канец).
9. Вэтэр и Зайцаў.—Чума сьвіней і захвам барацьбы з ёй.
10. Што зроблена па дозвах габсельсоравак.

Часопіс выходзіць 3 разы ў месяц.

Падпіску можна здаваць на пошту, лістаносцам, у кіёскі, ці прысылаць у выдавецтва «Зьвязда» (Савецкая, 63).

ЧАСОПІС КАШТУЕ:

1 месяц	20 кап.	Паўгода	1 р. 20 кап.
3 м-цы	60 кап.	Год	2 р. 40 кап.

Цана асобнага нумару 10 кап.

Чытайце, распасюджвайце і пішэце ў сваю часопісь.

Адрас рэдакцыі: Менск, вул. Энгельса, 28—тэлеф. 5-85

ВЭЛЁСЫПЭД—ПРАЦОЎНЫМ!

КІРАЎНІЦТВА АШЧАДКАСАМІ БССР

ДАВОДЗІЦЬ ДА ВЕДАМА ПРАЦОЎНЫХ, ШТО РЭАЛІЗАЦЫЯ

ВЭЛЁАБАВЯЗАЦЕЛЬСТВАЎ

1 і 2 сэрыі СКОНЧЫЛАСЯ

АПОШНІ ТЭРМІН набыцьця вэлёабавязацельстваў 3-й і 4-й сэрыі

15-га КАСТРЫЧНІКА

Кошт вэлёсыпэда 3-й сэрыі 151 руб. 50 к. і 4-й—150 р. Узносы ўносяцца падпісчыкамі роўнымі месячнымі, паўмесячнымі або квартальнымі ўзносамі да наступленьня тэрміну абавязацельства.

ПА ЖАДАНЬНІ РАБОТНІЦ ВЫПУШЧАНЫ АБАЯЗАЦЕЛЬСТВЫ НА ЖАНОЧЫЯ ВЭЛЁСЫПЭДЫ

10 проц. 4-й сэрыі—13 тыс. вэлёсыпэдаў—працоўным жанчынам.

Кіраўніцтва ашчадкасамі БССР.

Узмацняйце нашу вэлёпрамысловасьць! Набывайце ў ашчадкасах вэлёабавязацельствы!

Курсы чырвоных дырэктароў

пачалі працаваць з 1-га КАСТРЫЧНІКА

Усе прынятыя на курсы т. т., якія да гэтага часу не зьявіліся, павінны тэрмінова зьявіцца на заняткі.

ЗАВОЧНЫЯ БУХГАЛЬТАРСКІЯ КУРСЫ

Прыём слухачоў праводзіцца круглы год.

Прымаюцца асобы з 17-гадовым узростам з ась